

ВЁСКА ГАРЭЛА ДВОЙЧЫ...

8

ЯК ЗБЕРАГЧЫ НАШЫ «КОНІКІ»?

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. АЎТОРАК № 194 (29816)

## КОРАТКА

- **БУТБ: біржавыя цэны на піламатэрыялы для ўнутранага рынку знізіліся на траціну.**
- Праваслаўны форум «Пакроўскія сустрэчы» пройдзе 14—16 кастрычніка ў Полацку.
- **У БДУ пачалі прымаць заяўкі на новы XIII сезон праекта «Студэнт БДУ на тыдзень». Школьнікі з 31 кастрычніка да 4 лістапада змогуць стаць часткай найстарэйшай беларускай ВНУ.**
- У Беларусі пасеяна больш за 1 млн га азімых збожжавых.
- **Мабільны дадатак «Мой горад» пачаў працаваць у Бабруйску.**
- Графік руху цягнікоў па маршруце Магілёў — Гомель зменіцца ў кастрычніку з-за рамонтных работ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння ў краіне пасля дасягнення пенсіённага ўзросту працягваюць працаваць 400 тысяч чалавек. Найбольш актыўны ўзрост — да 65 гадоў. У гэтай узроставай катэгорыі працуе кожны трэці пенсіянер. Павелічэнне пенсіённага ўзросту якраз дало магчымасць прадоўжыць актыўны перыяд працоўнага жыцця. Мы актыўна развіваем валанцёрскую дзейнасць. Амаль дзве тысячы чалавек уваходзяць у валанцёрскія атрады. Таксама існуюць розныя праграмы для пажылых людзей, у тым ліку па навучанні камп'ютарнай адукаванасці, замежным мовам, дзе выкладчыкамі, трэнерамі выступаюць самі пажылыя грамадзяне».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПАВІНЕН БЫЦЬ ЖАЛЕЗНЫ ПАРАДАК»

### Прымаючы кадравыя рашэнні, Прэзідэнт гаварыў аб важным для ўсёй краіны

**Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся з кадравага панядзелка. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў кандыдатуры новых кіраўнікоў органаў мясцовай улады, дзяржаўных арганізацый і рэспубліканскіх органаў.**

## «НАСТРОЙВАЕМСЯ АДРАЗУ НА ПРЫСТОЙНЫ ТЭМП»

Міхаіл Бацэнка ўзначаліць Баранавіцкі гарвыканкам, Сяргей Ярэц — Жлобінскі райвыканкам. На пасаду старшыні Рэчыцкага райвыканкама заступае Сяргей Даўгалёў, старшыні Акцябрскага райвыканкама — Ірына Намачэнка. Лоеўскі райвыканкам узначаліць Алег Таргонскі, Лельчыцкі — Сяргей Дылюк. Кандыдатура Уладзіміра Антоненкі ўзгоднена Прэзідэнтам на пасаду старшыні Нараўлянскага райвыканкама. Валерый Хелскі — новы старшыня Гродзенскага райвыканкама, Аляксандр Студнеў узначаліць Магілёўскі гарвыканкам. У Бабруйскім гарвыканкаме таксама новы старшыня — Ігар Кісель. Андрэй Кажамякін прызначаны старшынёй Слаўгарадскага райвыканкама, Вольга Прыстромская ўзначаліла Бялыніцкі райвыканкам.



Фота БелТА.

Прэзідэнт адразу наладзіў новым кіраўнікам мясцовых органаў улады своеасаблівы экзамен: пацікавіўся сітуацыяй у рэгіёне і даў канкрэтныя даручэнні. Галоўным пытаннем стала, зразумела, сельская гаспадарка — завяршэнне ўборачнай кампаніі і пачатак пасяўной.

Напрыклад, у Валерыя Хелскага, прызначанага старшынёй Гродзенскага райвыканкама, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці ўсё на палях убрана. «Убіраем буракі, 40 працэнтаў па раёне ўбралі. На зерне — кукурузу», — далажыў кіраўнік раёна.

СТАР. 2

# БЯРОЗАВЫ ГАЙ У ПРАБІРЦЫ

**Вучоныя Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук актыўна заняліся мікраклanaваннем раслін. Такім навуковым падыходам хуткага і якаснага размнажэння дрэў займаліся і раней, але цяпер біятэхналогія выйшла на прамысловы ўзровень. У цяпліцах лесагадавальніка эксперыментальнай лясной базы НДІ лесу цяпер вырошчваецца больш як 12 тысяч саджанцаў асіны і бярозы, узрост якіх дзевяць месяцаў. Столькі ж знаходзіцца ў прабірках лабараторыі навукова-даследчага аддзела генетыкі, селекцыі і біятэхналогій НДІ лесу. З імі працуюць малодшы навуковы супрацоўнік, аспірант Марыя КУСЯНКОВА і інжынер навукова-даследчага аддзела генетыкі, селекцыі і біятэхналогій Алена ПАЛЕВІКОВА.**



Фота БелТА.

Павага і клопат

# СТАРАСЦЬ У РАДАСЦЬ

### Як арганізаваць вольны час на пенсіі

**Сёння ўсё больш пажылых людзей імкнецца весці актыўнае жыццё. Яны ўдзельнічаюць у грамадскіх ініцыятывах, займаюцца валанцёрствам, маюць хобі і гатовыя навучаць яму іншых. Пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што з году ў год расце колькасць слухачоў Універсітэта трэцяга ўзросту, дзе, між іншым, навучаюць «студэнтаў», якія дасягнулі 60-ці. Слухачы універсітэта вывучаюць замежныя мовы, псіхалогію і ландшафтны дызайн, вучацца камп'ютарным тэхналогіям, фатаграфіі і нават складанню генеалагічнага дрэва.**

Большасць актыўнасцяў, якія прапануюць для пажылых людзей у тых жа тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, бясплатная. Гэтак жа, як, дарэчы, і навучанне ў названай вышэй установе. Дастаткова толькі жадання пажылога чалавека спасцігаць новае, кантактаваць, быць карысным для іншых і заставацца цікавым для сваіх блізкіх.

СТАР. 9

ISSN 1990 — 763X

# «ПАВІНЕН БЫЦЬ ЖАЛЕЗНЫ ПАРАДАК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў новага старшыню Магілёўскага гарвыканкама Аляксандра Студнева, што ціск на яго будзе неймаверны, паколькі на яго вялікі разлік. Па словах кіраўніка дзяржавы, нягледзячы на тое, што ў Магілёве шмат зроблена, трэба даганяць іншыя гарады. «Настройваемся адразу на прыстойны тэмп», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама параіў рыхтавацца да сур'ёзнай працы і старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Андрэю Кажамякіну. Рэгіён няпросты. Прэзідэнт нагадаў, што неабходна правярыць, як рэалізуюцца мерапрыемствы праграмы развіцця паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці.

Новай старшыні Бялыніцкага райвыканкама Вользе Прыстромскай беларускі лідар расказаў, што ў савецкія часы ўсе хацелі працаваць у гэтым раёне. «Табе дастаўся цікавы раён, але праблем там нямала. Асабліва культура земляробства, кінутых земляў нямала, прашу звярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу», — папярэдзіў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не будзе навучаць і настаўляць новых кіраўнікоў мясцовых органаў улады. Гэта, па яго словах, людзі вопытныя, дасведчаныя, якія ведаюць, куды ідуць. «Калі шчыра казаць наконт будучага месца вашай працы, у асноўным гэта сельская гаспадарка. Тут у вас увогуле ніякіх не можа быць праблем», — сказаў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што самае галоўнае — для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў адкрыўся неабсяжны рынак. Кіраўнік краіны падкрэсліў, што Беларусь можа ўсё прадаць на рынках Расіі і Кітая. Віцэ-прэм'ер Леанід Заяц, які кантралюе аграрна-прамысловы комплекс, дакладвае, што ў краіне можна ў два разы павялічыць вытворчасць і ўсё прадаць па добрых цэнах. «Адкрыўся рынак, і цэны больш прыстойныя. Па сельскай гаспадарцы ўвогуле не павінна быць ніякіх праблем. Гэта 85 працэнтаў вашай працы. Астатняя — у кожнага ёсць раён, ёсць адукацыя, культура, ахова здароўя і гэтак далей. Гэтым трэба займацца. Хоць я не ўяўляю, што ў вашых раёнах там нейкі заняпад ці праблемы ў сацыяльнай сферы», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

## «ВЫ ПАВІННЫ БАЧЫЦЬ СВОЙ РАЁН, СВАІХ ЛЮДЗЕЙ»

Прэзідэнт адразу папярэдзіў, што жорсткія патрабаванні будуць прад'яўлены да інвестыцыйнага праекта, які старшыні райвыканкамаў павінны ажыццявіць. «У кожным раёне трэба стварыць новае прадпрыемства, новы аб'ект, прыкладна да 100 чалавек працоўных месцаў. Перспектыўнае добрае прадпрыемства, прадукцыю якога можна будзе прадаць найперш на знешніх рынках», — каторы раз паўтарыў задачу кіраўнік дзяржавы. Гэтае пытанне знаходзіцца на кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта і ўрада. «Не дай бог, будзе правалены гэты праект. У наступным годзе паглядзім, якія праекты рэалізавалі старшыні райвыканкамаў. Гэта нават не абмяркоўваецца», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама нагадаў, што Беларусь актыўна супрацоўнічае з Расіяй па ўсіх напрамках. І калі сёння з Расіі сышлі заходнія кампаніі, адкрыўся неабсяжны рынак. Вядома, адна Беларусь не справіцца з тым, каб запоўніць гэты дэфіцыт. Але, па словах беларускага лідара, наша прамысловая і сельскагаспадарчая прадукцыя вельмі запатрабавана ў Расійскай Федэрацыі, перш за ўсё па напрамку імпартазамяшчэння. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка паставіў перад старшынямі райвыканкамаў канкрэтную задачу — уключацца і дадаваць. «Размовы аб тым, што санкцыі, мабілізацыя і вайна, яшчэ штосьці, не прымаюцца. Забудзьцеся пра гэта. Вы павінны бачыць свой раён, сваіх людзей. Вы павінны своечасова пасеяць, сысці ў зіму, падняўшы зябліва, і рыхтавацца да вясновай сяўбы», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт заўважыў, што дажджы скончацца, і таму трэба прыбраць тое, што яшчэ засталося, асабліва кукурузу на зерне. Магчыма, яшчэ недзе засталіся бульба і цукровыя буракі. У некаторых раёнах трэба прыбраць лён. Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу: для таго, каб скончыць уборку, трэба мабілізаваць усіх. Ён звярнуў увагу, што ў некаторых школах забаронена прыцягваць дзяцей да збору ўраджаю. «Большай дзікасці я ўявіць не магу. Мы спрабуем выхаваць нашых школьнікаў, дзяцей. На чым іх выхоўваць? Балбатнёй? Балбатнёй не выхаваеш», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, як раней студэнты ездзілі ў верасні «на бульбу». Па словах Прэзідэнта, гэта аб'ядноўвае, гуртуе людзей, яны разумеюць, што гэта такое. «Не, гэта «эксплуатацыя». Якая эксплуатацыя, калі чалавек пяць-шэсць гадзін папрацуе? Бацькам у радасць і дзіцяці добрая фізічная падрыхтоўка. Мы ўсе працавалі, я дык дакладна. Мы не працавалі — мы ўколвалі, і дай бог як. Мабілізоўвайце студэнтаў, працоўных, дзяржаўных служачых, іншых людзей, каб дапамагчы гэта ўсё сабраць. Грошы прыстойныя можам зарабіць — не зараз, дык вясной», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама заўважыў, што трэба сачыць за тым, каб існавалі стабілізацыйныя фонды, каб людзям было што есці. Прэзідэнт канстатаваў, што цэны на бульбу, буракі, моркву, якія мы вырошчваем, не павінны расці ў геаметрычнай прагрэсіі. «На імпартныя тавары мы разбяромся па цэнах. Галоўнае, каб наша аналагічная прадукцыя кантралявалася па цэнаўтварэнні», — сказаў ён.



Фота БелТА.

Беларускі лідар заўважыў, што спраў сёлета яшчэ шмат. Ён папрасіў кіраўнікоў мясцовых органаў улады сур'ёзна да гэтага паставіцца і годна скончыць сельскагаспадарчы год. Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што кожны старшыня райвыканкама павінен сачыць за сітуацыяй на рынку працы ў сваім раёне. Засяродзіўся кіраўнік дзяржавы і на рабоце з кадрамі на месцах.

## «АДКАЗНАСЦЬ БУДЗЕ НЕЙМАВЕРНАЯ»

Прымаючы кадравыя рашэнні, Прэзідэнт запатрабаваў навесці парадак у кадравай рабоце і на ўзроўні аблвыканкамаў прыняць правілы перамяшчэння рабочай сілы. «Ніякага, вядома, прыгоннага права. Але любых перамяшчэнняў кіраўнікоў, спецыялістаў без вашага ведама быць не павінна, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да старшынь раённых, гарадскіх выканкамаў. Адміністрацыя Прэзідэнта разам з Урадам адказваюць за тое, каб была нарматыўная база пад гэта. Кіраўнік дзяржавы патрабуе навесці парадак па вертыкалі. Ніякага прыгоннага права быць не павінна, але ўсё павінна быць кіруема.

«Што гэта за «парадак» такі: мы рыхтуем тут аграрыяў, выпускаем сотнямі, а ў нас кадраў бракуе ў сельскай гаспадарцы?! Пагледзіце, дзе яны працуюць: дзесьці тата, дзесьці мама кудысьці прыстроілі сваё дзіця, вышэйшую адукацыю атрымалі, яны ў горадзе сядзяць, у вус не дзьмуць, атрымліваюць зарплату не менш, чым спецыяліст у калгасе, і яшчэ пасмейваюцца. На цябе дзяржава затраціла вялізныя грошы, дала табе адукацыю — будзь добры працаваць па спецыяльнасці. Гэта датычыцца ўсіх — і настаўніка, і ўрача, і культурнага работніка», — адзначыў Прэзідэнт. Ён паставіў задачу да 1 студзеня ўсталяваць адпаведную сістэму.

«Прыедзеце, мужыкі, на месца, не трэба ніяк ірвацца, не трэба залішняга ціску. Кожны ваш падначалены павінен мець шанец, права на нейкую, як цяпер модна казаць, памылку. Але не татальную, сур'ёзную памылку. Павінны працаваць і выконваць свае абавязкі. Менш глядзіце наверх. Больш павінна быць самастойнасці, таму што з вас адказнасць будзе неймаверная», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да назначаных кіраўнікоў мясцовай вертыкалі. Аднак для таго, каб вырашаць пытанні і несці за іх адказнасць, трэба мець правы і паўнамоцтвы, слушна заўважыў Прэзідэнт. «Вы сёння іх атрымалі — дзейнічайце», — заявіў ён.

## «АПЯРЭДЗІМ КАНКУРЭНТАЎ — БУДЗЕМ У ШАКАЛАДЗЕ»

Былога міністра прамысловасці Пятра Пархомчыка, які пайшоў на павышэнне і цяпер займае пасаду віцэ-прэм'ера, у міністэрстве змяніў Аляксандр Рагожнік, да нядаўняга часу генеральны дырэктар Мінскага маторнага завода. «Пётр Аляксандравіч, гэта ваша сфера, і я вас папярэджваў не адзін раз, што памылак быць не павінна. Асабліва з міністрам прамысловасці», — звярнуўся Прэзідэнт да Пятра Пархомчыка. Віцэ-прэм'ер запэўніў, што кандыдатура на пасаду міністра прамысловасці падабрана абсалютна правільна. Па яго словах, Аляксандр Рагожнік мае вялікі вопыт работы кіраўніка і добра ведае сваю галіну. Падчас

## У тэму

**Міністр прамысловасці Аляксандр РАГОЖНІК:**

— Прэзідэнтам дадзена даручэнне па захаванні дынамікі росту аб'ёму прамысловай вытворчасці, па нарошчванні экспартных паставак. Таксама асаблівую ўвагу трэба будзе надаць замацаванню кадраў, рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў, якія ажыццяўляюцца нашымі прадпрыемствамі, нарошчванню супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй. Такія праекты ў цяперашні час ужо ўзгоднены з расійскім бокам, вызначаны крыніцы фінансавання, у найбліжэйшы час мы прыступім да іх рэалізацыі. Каб быў вынік, неабходны згуртаваны, прафесійны калектыў. Самае галоўнае — мець жаданне працаваць.

Адказваючы на пытанне журналістаў, ці не палохае санкцыйны ціск, новы кіраўнік ведамства падкрэсліў, што час ніколі не быў просты. «Цяпер усё стала больш складаным, але не бывае ліха без дабра, — пераканаы міністр прамысловасці. — У людзей расплюшчыліся вочы, усе зразумелі, што ўвогуле трэба рабіць, хто сябар, а хто — вораг. І ўжо сёння зразумела: чым вышэйшая тэхналагічная незалежнасць, тым больш моцна стаіш на нагах. Неабходна мець кампетэнцыі ў многіх аспектах вытворчасці. На сённяшні момант гэтых кампетэнцый у Рэспубліцы Беларусь дастаткова, неабходна іх толькі развіваць».

**Генеральны дырэктар ААТ «ІНТЭГРАЛ» — кіруючая кампанія холдынга «ІНТЭГРАЛ» Андрэй БУЙНЕВІЧ:**

— Кіраўніком дзяржавы былі пастаўлены сур'ёзныя задачы па развіцці мікраэлектроннай галіны ў Рэспубліцы Беларусь. Гэтую задачу мы вырашаем разам з нашымі расійскімі партнёрамі ў межах работы ў Саюзнай дзяржаве. У канцы верасня ўрады Беларусі і Расіі падпісалі пагадненне аб развіцці мікраэлектроннай галіны. Гэта ўсяляе ў нас упэўненасць у тым, што мы сумеснымі намаганнямі нададзім новы імпульс у развіцці галіны не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў межах усёй Саюзнай дзяржавы. ААТ «ІНТЭГРАЛ» захаваў кампетэнцыі. Гэта наша вялікая канкурэнтная перавага. Мы і ў далейшым будзем удзяляць увагу гэтаму пытанню. Разам з Міністэрствам адукацыі распрацавана праграма па падрыхтоўцы кадраў, што ўсяляе ў нас упэўненасць у будучыні.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Сяргей БАРТАШ:**

— Гомельская вобласць для мяне новы рэгіён. Любое знаёмства пачынаецца з кадраў, тым больш Прэзідэнт даў даручэнне — разабрацца з кадравай палітыкай у Гомельскай вобласці. А гэта, напэўна, сёння самае важнае для эфектыўнай работы прадпрыемства любога рэгіёна. Што датычыцца сельскай гаспадаркі, трэба будзе разабрацца, пагледзець кліматычныя ўмовы. Для мяне складанасцяў не ўзнікне: па першай адукацыі я аграном, і асноўная мая працоўная дзейнасць звязана менавіта з вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Аляксандр СТУДНЕЎ:**

— Прэзідэнт адзначыў, што ўжо многае зроблена ў Магілёве, але трэба зрабіць яшчэ больш. Асноўны акцэнт — на кадры, развіццё горада. Горад павінен стаць яшчэ больш прыгожы: трэба наблізіцца да тых тэндэнцый, якія сёння бачым у такіх нашых гарадах, як Мінск, Брэст, Гомель. Людзі павінны разумець пастаўленыя задачы і з дакладнасцю іх выконваць. Мы прызвычаіліся казаць, што цяпер час складаны. Аднак гэта час і нашых магчымасцяў. Сёння мы знаходзім новыя рынкі збыту, наша прадукцыя стала яшчэ больш запатрабаванай. Трэба задзейнічаць усе магчымыя механізмы, якія мы можам рэалізаваць, у тым ліку ў выпуску новай прадукцыі, тэхнікі — патэнцыял дастаткова вялікі. Трэба ісці на гэтыя рынкі, прапаноўваць магчымыя варыянты ўзаемадзеяння паміж суседзямі. Нельга спыняцца толькі на расійскім рынку. Сёння Беларусь — імпартазамяшчальная краіна. Нам ёсць што паказаць, самае галоўнае — паказаць на высокім узроўні свае якасці.

**Старшыня Бялыніцкага райвыканкама Вольга ПРЫСТРОМСКАЯ:**

— Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што Бялыніцкі раён — візітка Магілёўшчыны. Таму асаблівую ўвагу прыйдзецца ўдзяляць навядзенню парадку. Прыярытэтным кірункам застаецца сельская гаспадарка. Пастаўлена задача па рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Вядома, вялікая ўвага — рабоце з насельніцтвам. Думаю, што ў Бялыніцкім раёне моцныя кадры, таму ўсе разам, у адзінстве, згодзе, падтрымліваючы адно аднаго, выканаем пастаўленыя задачы.

яго працы на Мінскім маторным заводзе была праведзена вялікая работа над мадэрнізацыяй прадпрыемства, завод выйшаў на высокі ўзровень інвестыцыйнага развіцця, у калектыве склаўся добры мікраклімат. «Прадпрыемства працуе сістэмна, нарошчвае аб'ёмы вытворчасці, з'яўляюцца новыя віды прадукцыі, якая экспартуецца за межы Рэспублікі Беларусь», — расказаў Пётр Пархомчык.

Прэзідэнт пацікавіўся, хто заменіць Аляксандра Рагожніка на Мінскім маторным заводзе. Па яго словах, нагрузка на завод будзе прыстойная. «Замену мы падрыхтавалі. Кіраўнік будзе з іншага прадпрыемства. З добрым вопытам работы на Беларускім аўтамабільным заводзе. Малады, перспектыўны», — адказаў Пётр Пархомчык.

Аляксандр Рагожнік расказаў, што на Мінскім маторным заводзе створаны калектыў спецыялістаў, якія могуць выканаць усе пастаўленыя тэхнічныя задачы. На прадпрыемстве распрацавана стратэгія, усё раскладзена па палічках. Таму на пасадзе генеральнага дырэктара патрэбен чалавек, які б гэту работу ўзначаліў і павёў наперад. «Мінскі маторны завод стаў самым буйным вытворцам рухавікоў на постсавецкай прасторы. У гэтым годзе выйдзем на аб'ём больш за 50 тысяч матораў. Мы сёння робім рухавікоў столькі, колькі тры вытворцы ў Расіі. Самае галоўнае — мы закрылі ніжнюю лінейку, усё, што трапіла пад санкцыі. Мы не спынілі трактарны завод, «АМКАДОР» па гэтай лінейцы», — расказаў Аляксандр Рагожнік.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што імпартазамяшчэнне будзе важным не толькі па рухавіках, але і па іншых камплектуючых. «Як бы ні было складана, калі мы цяпер на нашым рынку, перш за ўсё постсавецкім, расійскім, апярэдзім канкурэнтаў, то будзем, як прамыслоўцы гавораць, у шакаладзе», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што кіраваць цэлай галіной складаней, чым адным заводам. «Калі на маторным заводзе ўсё так, як вы мне кажаце, значыць, вы там рэвалюцыю здзейснілі. У нас было шмат прэтэнзій да маторнага завода. Вы, работнікі вытворчасці, ведаеце, што трэба ісці, не спыняючыся і не бяздзейнічаць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама звярнуў увагу, што новаму міністру патрэбны будуць намеснікі. Так, намеснікам міністра прамысловасці назначаны генеральны дырэктар «АМКАДОРА» Аляксандр Яфімаў.

### ПАТРЭБЕН КАПІТАЛЬНЫ ПРАРЫЎ

Колішні намеснік міністра прамысловасці Андрэй Буйневіч будзе кіраваць «ІНТЭГРАЛАМ». «Сам ідзеш? Ці прагналі?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. Ён адказаў, што на новую пасаду ідзе свядома і што вытворчасць яму знаёмая. Андрэй Буйневіч — старшыня назіральнага савета дадзенага таварыства. Будучы намеснікам міністра, курыраваў гэтую галіну.

«Самая цяжкая, праблемная, але вельмі запатрабаваная тэма», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, на нядаўніх перагаворах з Уладзімірам Пуціным расійскі прэзідэнт сказаў, што гатовы плаціць любыя грошы за прадукт мікраэлектронікі. «Трэба прызнацца, мы прыстойна загубілі на постсавецкай прасторы гэты кірунак. Без яго нельга, без яго не лятаюць ні самалёты, ні ракеты, высокадакладная зброя не працуе — нічога не працуе. Дзякуй богу, што мы захавалі гэтую вытворчасць. Таму я нездарма сказаў, што трэба разабрацца ў гэтай вытворчасці глыбока, арганізаваць працэс. Там патрэбен капітальны прарыў», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, у гэтую сферу будуць інвеставаць і беларусы, і расіяне, бо адкрываецца глабальны рынак: беларуска-расійскі, постсавецкі. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што добрую прадукцыю купяць усюды, але канкурэнты шалёныя. «Дзякуй богу, што яны сышлі з нашага рынку, значыць, мы будзем запатрабаваныя. Таму з Расіяй разам трэба займацца гэтым напрамкам, таксама нясоладка будзе. Разбірайся, унікай», — параіў кіраўнік дзяржавы новаму дырэктару.

### «ЧАКАЕМ НЕ РЭВАЛЮЦЫІ, АЛЕ СУР'ЁЗНЫХ ЗРУХАЎ»

Новы генеральны дырэктар і на «Магілёўхімвалакне». Ім стаў былы дырэктар Завода горнага воску Уладзімір Маркаў. «Хацелася б, каб ужо з сённяшняга дня ты ўжо пачаў там дабаўляць. Не сказаць, што мы яго ўпусцілі. Проста спадзяваліся залішне, што там цяперашні ці былы — як яго назваць! — дырэктар паправіць справу. Але па розных прычынах, у тым ліку аб'ектыўных, не ўсё атрымалася. Таму мы ад цябе таксама чакаем там не рэвалюцыі, але вельмі сур'ёзных зрухаў», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў прарэвізаваць на «Магілёўхімвалакне» намечаныя праекты, пры неабходнасці рэалізаваць іх у паскораным парадку. «Хімвалакно» для Магілёва — ты ведаеш што. Гэта вельмі важнае прадпрыемства», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### ВОПЫТ СПРЫЯЕ РУХУ НАПЕРАД

Былы старшыня Бярозаўскага райвыканкама Сяргей Барташ прызначаны памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Гомельскай вобласці. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на гэтую пасаду было пяць-шэсць прапаноў, але Сяргея Барташа выбралі як чалавека, які прайшоў усе прыступкі. «Самае галоўнае, твой вопыт павінен паспрыяць руху Гомеля наперад. Там працуе былы міністр сельскай гаспадаркі. Яму трэба добрая падтрымка ў тваёй асобе ў якасці памочніка Прэзідэнта. І з кадрамі там няпроста, а ты інспектар, табе прыйдзецца кантраляваць падбор кадраў і потым — навядзенне парадку, дысцыпліну», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што трэба пакласці канец цякучцы кадраў. «Шалтай-балтай, хачу — працую, хачу — не, заяву кінуў, пайшоў у камерцыйную структуру працаўладкаваўся — гэтаму трэба пакласці канец. Павінен быць жалезны парадак. Не прыгоннае права, але парадак павінен быць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Пэўныя змены адбыліся і ў кіраўніцтве рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання. Пасаду першага намесніка міністра архітэктуры і будаўніцтва заняў Алег Швец, намесніка міністра — Аляксандр Шваюноў. Першым намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя прызначаны Аляксандр Корбут, намеснікам міністра ў гэтым жа ведамстве — Іван Прыходзька. Алег Казарэдаў прызначаны старшынёй праўлення ААТ «Беларускі банк развіцця і рэканструкцыі «Белінвестбанк». Намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама стаў Андрэй Жук, членам Гродзенскага аблвыканкама — Анатоль Дарожка. Членам Мінскага гарвыканкама прызначаны Юрый Фралоў.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
**Вераніка КАНЮТА.**

Прыярытэты

# ПАСПЯХОВА ПРОЦІСТАЯЦЬ САНКЦЫЯМ

## Беларусь і Расія ўмацоўваюць супрацоўніцтва

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка ў Маскве на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Расіі Міхаілам Мішусціным, паведаміла БелТА.**

«Інтэнсіўнасць кантактаў на ўсіх узроўнях, якую мы назіраем, пацвярджае зацікаўленасць у падтрыманні патрэбнай дынамікі ў актывізацыі двухбаковых адносін, аператыўнай выпрацоўцы ўзгодненых падыходаў для процідзеяння ашалеламу знешняму ціску, — сказаў Раман Галоўчанка. — У ходзе нашых сустрэч мы неаднойчы гаварылі, што толькі дзякуючы сумесным намаганням здолеем супрацьстаяць гэтым шалёным санкцыям, накіраваным на разбурэнне нашых дзяржаў. Як бачым, гэта не проста словы, мы не толькі супрацьстаім, але і ў гэтых вельмі няпростых умовах паспяхова развіваем узаемны гандаль, умацоўваем вытворчыя сувязі і ствараем новыя транспартна-лагістычныя ланцужкі. Сёння ва ўмовах нябачанага палітычнага і эканамічнага ціску наша інтэграцыя прайшла сур'ёзны этап праверкі на трываласць, даказаўшы сваю эфектыўнасць і гатоўнасць супрацьстаяць любым выклікам і пагрозам».

Раман Галоўчанка адзначыў, што прэзідэнты Беларусі і Расіі па выніках сустрэчы, што адбылася на мінулым тыдні ў Сочы, далі канкрэтныя даручэнні. «Наша задача — забяспечыць іх безумоўную практычную рэалізацыю», — дадаў ён.

Беларусь і Расійская Федэрацыя па выніках года дасягнулі рэкорднага тавараабароту $45 млрд, а можа, і больш, заявіў Раман Галоўчанка. Кіраўнік беларускага ўрада канстатаваў, што па выніках 8 месяцаў гэтага года аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на больш чым 12 працэнтаў. «Безумоўна, такія вынікі сведчаць, што была выбрана правільная стратэгія па замяшчэнні прадукцыі замежных вытворцаў, якія спынілі пастаўкі тавараў у нашы краіны. Арганізацыя сумесных вытворчасцяў дазволіць і дае магчымасць не толькі адыходзіць ад залежнасці ад імпарту ў вузлах і абсталяванні, камплектуючых, але і, відома, стварае новыя працоўныя месцы і надзейны падмурак для далейшага інавацыйнага развіцця эканомік нашых краін. У гэтым напрамку ўжо зроблена дастаткова шмат, але вельмі аб'ём работы яшчэ наперадзе», — адзначыў Раман Галоўчанка. Ён таксама канстатаваў, што пры падтрымцы расійскага боку Беларусі ўдалося стабілізаваць экспартныя транспартныя патокі.

Развіццё інтэграцыі Беларусі і Расійскай Федэрацыі дасць эфектыўны адказ на эканамічны ціск з боку недружалюбных краін, адзначыў прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Мішусцін. «Урад Расіі надае асаблівае значэнне ўмацаванню сяброўскіх, партнёрскіх і саюзніцкіх адносін з брацкай Беларуссю. Перакананы, што развіццё інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве таксама дасць эфектыўны адказ на новыя выклікі, яны звязаны з санкцыйным ціскам з боку недружалюбных дзяржаў, якія параўнальны з татальнай эканамічнай вайной, — сказаў Міхаіл Мішусцін. — Бакі прымаюць скаардынаваныя меры, накіраваныя на абарону эканамічнай бяспекі, тэхналагічнага суверэнітэту Беларусі і Расіі».

Прэм'ер-міністр РФ канстатаваў, што, нягледзячы на складаную эканамічную кан'юнктуру і крызісныя з'явы ў глабальнай эканоміцы, тавараабарот Расіі і Беларусі дэманструе ўпэўнены рост. «У мінулым годзе ён дасягнуў рэкорду $38,5 млрд, але ў студзені–ліпені гэтага года павялічыўся да $22 млрд. Апераджальнымі тэмпамі расце беларускі экспарт у Расію — на чвэрць у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года», — адзначыў Міхаіл Мішусцін.

Надвор'е

# З ЧАЦВЯРГА ВЫГЛЯНЕ СОНЕЙКА І БУДЗЕ КАЛЯ 20 ЦЯПЛА

## У паўднёвы захад краіны прыйдзе нясмелае бабіна лета

**За першыя дні кастрычніка па ўсходняй палове краіны выпала больш за палову месячнай нормы ападкаў, па Гомельскай і месцамі Мінскай абласцях сума ападкаў перавысіла сярэднія месячныя значэнні. Але на працягу тыдня ападкі «выдыхнуцца» канчаткова, а значыць, усталюецца сярэднецёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны захаваюцца дажджы. Па заходняй палове рэгіёна захаваецца моцны парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 6 да 12 градусаў цяпла, а па захадзе паветра прагрэецца да 15 градусаў.

У сераду да світання яшчэ адаб'ецца ўплыў цыклону. Таму ноччу і раніцай месцамі па краіне будуць адзначацца кароткачасовыя дажджы. Удзень характар надвор'я ў краіне пачне змяняцца. У большасці раёнаў ападкі спыняцца. Толькі па паўночным усходзе рэспублікі будуць адзначацца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у заходніх раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 2 да 8 градусаў цяпла, а днём ад плюс 9 да плюс 14 градусаў. Па паўднёвым захадзе краіны слупок тэрмометра падымецца да 16 градусаў са знакам плюс.



Пачынаючы з чацвярга надвор'е выправіцца канчаткова, а тэмпературны фон пачне павышацца. У гэты дзень чакаецца пераважна без ападкаў, толькі месцамі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы плюс 4—10 градусаў. Удзень — ад плюс 12 градусаў па паўночным усходзе да плюс 20 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу будзе без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі туман. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 3—10 градусаў, а днём — плюс 13—19 градусаў. І ў суботу таксама будзе без дажджоў. Ноччу і раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—9 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 13—20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Чулі?

### У КРАІНЕ ПРАХОДЗІЦЬ КОМПЛЕКС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ «АРСЕНАЛ»

**Як паведамілі БелТА ў Міністэрстве ўнутраных спраў, з 3 па 7 кастрычніка праваахоўнікі праводзяць комплекс мерапрыемстваў па папярэджанні і спыненні правапарушэнняў у сферы абароту зброі і боепрыпасаў.**

Супрацоўнікі міліцыі будуць правяраць умовы захоўвання грамадзянамі зарэгістраванай зброі, а таксама выяўляць уладальнікаў нелегальных арсеналаў. Асноўная мэта мерапрыемства — прафілактычная работа з уладальнікамі зброі па пытаннях выканання правілаў яе выкарыстання і захоўвання, мер бяспекі, а таксама інфармаванне насельніцтва аб добраахвотнай здачы зброі, якая захоўваецца незаконна.

Усяго за восем месяцаў гэтага года з абароту выключана больш за 400 адзінак незарэгістраванай зброі і амаль 35 тысяч боепрыпасаў рознага калібру. Добраахвотна здадзена больш за 400 адзінак нелегальнай зброі і каля 163 тысяч боепрыпасаў. Акрамя таго, за розныя парушэнні ў індывідуальных уладальнікаў канфіскавана больш за 1,5 тысячы адзінак зарэгістраванай зброі.

У МУС нагадалі, што асобы, якія добраахвотна здаюць у органы ўнутраных спраў зброю і боепрыпасы, якія незаконна захоўваюцца, вызваляюцца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Танкевічу Уладзіміру Валерыевічу, намесніку кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# БАНКАМАТЫ ПОЎНАГА ЦЫКЛА,

## або Чуткі пра «смерць» наяўных моцна перабольшаны

**Дзякуючы нацыянальнай плацежнай сістэме, насельніцтва санкцыі супраць нашых банкаў амаль не заўважыла. Сёння работнікі Банкаўскага працэсінгавага цэнтра могуць сказаць, што за кароткі час установа стала лідарам у сваёй галіне — як па колькасці, так і па якасці паслуг. Цэнтру споўнілася 20 гадоў. Генеральны дырэктар ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» Аляксандр СОТНІКАЎ пагадзіўся адказаць на нашы пытанні.**



***— Ці можна заявіць, што працэсінгавы цэнтр стаў ядром плацежнай інфраструктуры Беларусі?***

— Атрымліваецца, што так. І аб гэтым сведчаць лічбы і факты нацыянальнай статыстыкі. Па-першае, цяпер цэнтр абслугоўвае звыш 125 тысяч плацежных тэрміналаў у амаль 75 тысячах гандлёвых пунктах. Мы з'яўляецца лідарамі тэрмінальнага рынку, але спачываць на лаўрах, вядома ж, не збіраемся, бо тут высокая канкурэнцыя.

Па-другое, у месяц праз наш цэнтр праходзіць больш за 200 мільёнаў фінансавых аперацый, а колькасць абслужаных картак хутка наблізіцца да дзесяці мільёнаў.

Банкаўскі працэсінгавы цэнтр працягвае ўкараняць новыя сэрвісы і пашыраць функцыянал плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ, напрыклад: пераводы паміж трымальнікамі айчынных картак дапоўнены магчымасцю правядзення «разрыўных» P2P, таксама сумесна з банкамі і плацежнай сістэмай «Мір» рэалізаваны трансгранічныя пераводы паміж карткамі БЕЛКАРТ і «Мір», банкам-эмітэнтам плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ таксама стала даступная для далучэння тэхналогія бяспечных плацяжоў у асяроддзі электроннай камерцыі плацежнай сістэмы «Мір» — MirAccept 2.0. Ну і, вядома, запуск інавацыйнага для Беларусі плацежнага мабільнага дадатку БЕЛКАРТ PAY.

***— Як хутка мы ажыццявім поўны пераход на каналы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, ці «кэш» будзе жыць і далей?***

— Я доўгі час шчыра лічыў, што наяўныя грошы беспэрспектыўныя, і час іх сыходу не за гарамі. Аднак, як паказвае практыка, не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце, чуткі пра «смерць» наяўных моцна перабольшаны. У перыяд геапалітычнай турбулентнасці наяўныя аказаліся адным з самых суверэнных (разам з нацыянальнымі плацежнымі сістэмамі) сродкаў плацяжу.

Так, падтрыманне наяўна-грашовага абароту — рэч дарагая для дзяржавы, але, як паказвае практыка, наяўныя — пакуль яшчэ сур'ёзная альтэрнатыва безнаяўным сродкам. Безумоўна, намаганні дзяржавы вывесці наяўны абарот з ценю значныя і адчувальныя, аднак застаецца яшчэ дастаткова шмат галін нашага жыцця, дзе пераважаюць менавіта наяўныя.

І гэта не толькі славутыя рынкі, але і плацяжы на карысць рамеснікаў, напрыклад. І я кажу толькі пра плацяжы ў «белай» зоне, а колькі іх у «шэра-чорнай»? У сельскай мясцовасці за машыну пяску, за паслугі па ўзворванні, касьбе, за будаўнічыя работы, якія аказваюцца неафіцыйна, з-за зразумелых прычын, гаворка пра безнаяўны разлік у прынцыпе не ідзе. За рэдкім выключэннем не прыжываюцца безнаяўныя плацеж пакуль і ў сферы паслуг і тавараў рэлігійнага прызначэння. Увогуле, пакуль наяўныя грашовыя сродкі з'яўляюцца неад'емнай часткай нашай плацежнай экасістэмы. І, натуральна, з імі трэба працаваць, іх трэба абслугоўваць.

Таму я лічу, што банкаматны бізнес дакладна не памірае, хутчэй адбываецца сур'ёзная яго трансфармацыя. Цяпер ва ўсім свеце, у тым ліку і ў нашай краіне, выразна вызначаецца трэнд на замену ўстарэлых мадэляў з адзінай функцыяй — зняцця наяўных, на сучасныя шматфункцыянальныя банкаматы. Іх яшчэ называюць банкаматамі поўнага цыкла або рэсайклінгавымі банкаматамі. Іх асноўная асаблівасць у тым, што ў гэтых банкаматах рэалізаваны поўны цыкл рэцыркуляцыі наяўных — яны і выдаюць, і прымаюць наяўныя. Больш за тое прынятыя наяўныя пералічваюцца і могуць быць выдадзены іншаму кліенту.

Такія банкаматы, калі іх устанавіць у месцах са збалансаваным абаротам па прыёме/выдачы наяўных, значна радзей інкасуюцца. Акрамя таго, варта адзначыць, што банкі сёння выкарыстоўваюць бескантактавыя экасістэмы. І калі пытанні з бескантактавымі плацяжамі ў гандлі ўжо даўно закрытыя, то казаць пра 100 % бескантактавай функцыянальнасці банкаматнага парка Беларусі пакуль яшчэ рана. Для рэалізацыі гэтай задачы банкі цяпер закупляюць выключна банкаматы з магчымасцю ажыццяўлення бескантактавых аперацый.

Трэба звярнуць увагу на тое, што цяпер банкамат становіцца па-сапраўдному шматфункцыянальнай прыладай. У спектр аперацый, якія ажыццяўляюцца ў сучасных банкаматах беларускіх банкаў, акрамя стандартных, уваходзяць і прыём плацяжоў (як у наяўнай, так і безнаяўнай формах), і валютна-абменныя аперацыі, і прыём выручкі ад юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, і правядзенне аперацый без выкарыстання карткі, і дэпазітныя аперацыі. У цэлым і вонкавае аблічча, і ўнутранае напаўненне сучаснага банкамата прынцыпова адрозніваецца ад яго папярэднікаў 1990-х — 2000-х гадоў.

***— Мы чулі, што вы ўваходзіце ў гэты рынак на новай тэхналагічнай платформе...***

— У выніку шэрагу прычын наш цэнтр, які доўгія гады быў значным гульцом на банкаматным рынку, у апошнія некалькі гадоў пайшоў з яго. У 2021 годзе мы задумаліся аб вяртанні. І магу сказаць, што менш чым за год мы правялі велізарны аб'ём метадалагічных, юрыдычных, тэхналагічных і інтэграцыйных работ і гатовыя да выхаду на рынак банкаматаў кітайскага вытворцы GRG. У цяперашні час нашы банкаматы праходзяць доследна-прамысловую эксплуатацыю ў найбуйнейшым банку краіны.

***— Бяскартачныя транзакцыі з выкарыстаннем розных гаджэтаў... Сапраўды, на картачным рынку адбылася эвалюцыя. Раскажыце аб трэндах у гэтым напрамку.***

— Варта адрозніваць тыпы транзакцый. Існуе, напрыклад, згенерыраваны іншымі плацежнымі форм-фактарамі (гадзіннікі, пярсцёнкі і іншае), але апрацаваны па картачных правілах і тэхналогіях. Ёсць транзакцыі, якія не маюць дачынення да картачных тэхналогій (плацяжы з рахункаў, плацяжы з выкарыстаннем электронных грошай і іншыя).

Абодва тыпы транзакцый мяняюць плацежны вопыт канчатковага спажыўца, бо фарміруюць бяскартачныя, у пераважнай большасці выпадкаў бяскантактавыя, узаемадзеянні паміж спажыўцом і ўсімі астатнімі ўдзельнікамі працэсу (банкаматамі, гандлярамі, банкамі і тэрміналамі).

І ў такім успрыманні «бяскартачных транзакцый» я назваў бы адзін, у маім разуменні самы галоўны, агульны трэнд — стварэнне бескартачных бясшвовых экасістэм, у якіх спажывец можа атрымаць максімальна поўны аб'ём плацежных паслуг, не выкарыстоўваючы картку ў якасці базавага інструмента. Атрымліваецца, што ў такіх экасістэмах акцэнт з карткі як першаснай крыніцы транзакцый ссоўваецца на іншыя фактары.

Тут, на маю думку, першынство належыць розным плацежным праграмам, і мабільны тэлефон дэ-факта замяняе картку. Ужо цяпер у Беларусі ёсць банкі, якія актыўна фарміруюць такія бяскартачныя экасістэмы, у якіх чалавеку картка наогул не патрэбная — ён можа з выкарыстаннем плацежнага дадатку і расплаціцца ў любых фізічных гандлёвых пунктах, і правесці аперацыі ў банкаматах і інфакіёсках, і правесці аплату ў інтэрнэт-крамах. Мне здаецца, што гэта вельмі зручна, бо цяжка ўявіць сучаснага чалавека без смартфона — ён з намі заўсёды, таму і ссоўванне акцэнтаў на карысць плацежных праграм цалкам зразумелае. Да астатніх плацежных гаджэтаў я стаўлюся хутчэй як да цацак, незвычайных аксесуараў, не больш за тое.

Зусім іншая гісторыя, калі «бяскартачныя транзакцыі» наогул не маюць дачынення да картачных тэхналогій. Сярод вядучых тэхналогій у дадзеным сегменце развіцця, безумоўна, першую скрыпку іграюць QR-коды. У краіне ўжо ёсць некалькі сур'ёзных праектаў, якія базіруюцца на QR-кодах, яны займаюць пэўныя нішы, у якіх традыцыйныя картачныя тэхналогіі альбо слаба прадстаўлены, альбо іх наогул няма. Сярод такіх праектаў ёсць як монабанкаўскія, так і міжбанкаўскія рашэнні і ў іх, безумоўна, ёсць будучыня. На маю думку, іх роля на плацежным рынку будзе толькі ўзрастаць.

***— Задача любой унутранай плацежнай сістэмы — абараняць інтарэсы грамадзян, і сёння мы можам пачуць, што гэта «плацежная сістэма ў тапках», маўляў, свая, родная, не падвядзе, заўсёды спрацуе. На якім этапе развіцця БЕЛКАРТ знаходзіцца цяпер?***

— Гэтая сістэма знаходзіцца на этапе значнага росту як з пункту гледжання пашырэння функцыянальнасці, так і з пункту гледжання колькасці картак у абароце.

Мы практычна функцыянальна зраўняліся з міжнароднымі аплатнымі сістэмамі (засталося яшчэ некалькі параўнальна нязначных тэхналагічных аспектаў, якія мы плануем закрыць у 2023 годзе). Не пабаюся сказаць, што ў складанай геапалітычнай сітуацыі, у якой апынулася наша краіна, менавіта БЕЛКАРТ выратавала картачны рынак краіны. Трымальнікі картак беларускіх банкаў практычна не заўважылі тых бур і ўраганаў, якія бушавалі ў плацежнай экасістэме ў лютым-сакавіку бягучага года.

Не было б у краіне БЕЛКАРТ — наступствы былі б значна больш сур'ёзнымі. Многія санкцыйныя банкі пазбавіліся б значнай долі сваіх картачных партфеляў, трымальнікі адчулі б значныя нязручнасці ў карыстанні карткамі — яны страцілі б сваю сістэмнасць, імі нельга было б разлічыцца ў любых пунктах прыёму любых банкаў. Усяго гэтага дзякуючы БЕЛКАРТ і Банкаўскаму працэсінгаваму цэнтру не адбылося. Вядома, картачны рынак Беларусі часткова страціў такую ўпадабаную многімі нішу, як аплата з выкарыстаннем плацежных дадаткаў SamsungPay, ApplePay у крамах, бо па картках санкцыйных банкаў правядзенне такога кшталту аперацый немагчымае ў любых элементах аплатнай інфраструктуры, але і ў тэрміналах санкцыйных банкаў немагчымае правядзенне такога кшталту аперацый незалежна ад таго якім банкам (санкцыйным ці не) выпушчана картка.

Менавіта таму вельмі важны і запатрабаваны рынкам новы прадукт плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ — плацежны дадатак БЕЛКАРТ PAY, які дазваляе выкарыстоўваць тэлефоны з АС Android для правядзення бескантактавых безнаяўных аперацый практычна ва ўсіх магазінах нашай краіны.

Гэта вялікі прарыў для нашага рынку. Разам з тым усе тэхналагічныя магутнасці для забеспячэння функцыянавання дадзенага прадукту размешчаны на тэрыторыі Беларусі, што дазваляе яшчэ больш узмацніць плацежны суверэнітэт краіны. Мы працуем і над тым, каб наша рашэнне з'явілася на тэлефонах Huawei (плануем у пачатку наступнага года парадаваць уладальнікаў тэлефонаў дадзенага брэнда), і на тэлефонах Apple (тут усё складаней з-за жорсткай пазіцыі Apple, але мы працягваем перагаворы з імі).

БЕЛКАРТ PAY стане нашым флагманскім прадуктам — мы будзем пашыраць яго функцыянальнасць, у тым ліку і за кошт імплементацыі ў яго праграмы лаяльнасці, запусціць якую мы плануем у сярэдзіне наступнага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Bloomberg: Еўрасаюз не можа ў найбліжэйшы час замяніць пастаўкі расійскага газу

Еўрасаюз у найбліжэйшай перспектыве не зможа забяспечыць сабе пастаўкі газу на ўзроўні стандартнага імпарту з Расіі. Пра гэта Bloomberg заявіў прэм'ер-міністр Грэцыі Кіръякас Міцатакіс.

«Здольнасць Еўропы замяніць расійскі газ залежыць як ад фізічных фактараў, так і ад эканамічных: як бы ні раслі цэны, Еўропа ў цэлым не зможа ў кароткатэрміновай перспектыве цалкам замясціць аб'ёмы газу з РФ, якія яна страціла», — адзначыў Міцатакіс.

Паводле яго слоў, ЕС сутыкнуўся з сур'ёзным дысбалансам, які нельга выправіць аднымі цэнамі. Ён дадаў, што толькі ў першым квартале ЕС заплаціў за газ на 62 млрд больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Таму дадатковыя выдаткі па выніках года могуць вылічацца сотнямі мільярдаў еўра, а пры сукупных пабочных эфектах — трыльёнамі. З-за гэтага неабходна ўвесці гранічныя цэны на ўвесь газ, у тым ліку і з Расіі.

30 верасня дзяржсакратар ЗША Энтані Блінкен на сумеснай прэс-канферэнцыі з міністрам замежных спраў Канады Мелані Жалі заявіў, што ўлады ЗША разглядаюць бягучую сітуацыю ў Еўропе як магчымасць «раз і назаўжды» скончыць з залежнасцю рэгіёна ад расійскіх энергарэсурсаў.

### Кадыраў заявіў аб адпраўцы трох непаўналетніх сыноў у зону СВА

Трое непаўналетніх сыноў кіраўніка Чачні Рамзана Кадырава ў найбліжэйшы час адправяцца ў зону правядзення спецаперацыі ва Украіне. Аб гэтым Кадыраў напісаў у сваім тэлеграм-канале.

«Настаў час паказаць сябе ў рэальным баі, і гэтае іх імкненне я толькі вітаю. Хутка яны адправяцца на перадавую і будуць знаходзіцца на самых складаных участках лініі судакранання», — напісаў Кадыраў.

«Унукам першага прэзідэнта Чачэнскай Рэспублікі, Героя Расіі Ахмата-Хаджы Кадырава — Ахмату, Элі і Адаму 16, 15 і 14 гадоў адпаведна. Але іх ваенная падрыхтоўка пачалася яшчэ даўно, ледзь не з малых гадоў», — паведаміў палітык.

### Кісіда не выключыў нанясення Японіяй удараў у адказ для абароны насельніцтва



Урад Японіі плануе актывізаваць вывучэнне розных спосабаў умацавання абараназдольнасці краіны, не выключаючы верагоднага нанясення ўдараў у адказ па тэрыторыі праціўніка, заявіў прэм'ер краіны Фуміа Кісіда. Пра гэта паведамляе ТАСС.

Сітуацыю з абараназдольнасцю Токіа прэм'ер-міністр ацаніў падчас пленарнага пасяджэння ніжняй палаты парламента. «Мы актывізуем рэальны разгляд спосабаў, неабходных для абароны нашага народа, не выключаючы ніякіх варыянтаў, у тым ліку так званыя магчымасці для нанясення ўдараў у адказ», — звярнуў увагу японскі палітык.

Яшчэ Кісіда ўдакладніў, што абараназдольнасць краіны трэба карэнным чынам умацаваць на працягу наступных пяці гадоў.

Ураджай-2022

# «Дажынкі» як сімвал магутнасці і стабільнасці дзяржавы»

## Працаўнікоў Гродзеншчыны ў першы дзень кастрычніка віталі ў Вялікай Бераставіцы

**Гарадскі пасёлак упершыню стаў сталіцай абласнога фестывалю «Дажынкі». Перад прыёмам гасцей населены пункт значна аднавіўся. Павіншаваць работнікаў сельскай гаспадаркі прыехалі высокія госці. Найлепшыя атрымалі дастойныя ўзнагароды, усе ўдзельнікі мерапрыемства змаглі акунуцца ў атмасферу свята.**



Прыгожы падарунак усім прысутным падарыў міні-фестываль «Вянок маладосці», на якім прадстаўніцы ўсіх 17 раёнаў Гродзенскай вобласці дэманстравалі ўнікальныя галаўныя ўборы з кветак і каласоў. Багаццем сельскагаспадарчых культур уражваў кожны раённы падворак. Сустракаў гасцей цар-каравай у атачэнні 17 пірагоў. Іх, дарэчы, было значна больш. І тут было на што паглядзець, асабліва ў рамках конкурсу. Дарэчы, цікавыя спаборніцтвы, такія як «яблычны снайпер», «аграрны баскетбол» і «бой падушкамі», увайшлі ў любімую для многіх «Сельскую эстафету».

А пачаўся фестываль традыцыйным шэсцем з сімвалічнай назвай «Ад зярнятка да каравая». Героі ўрачыстасці — кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, спецыялісты агранамічнай службы, механізатары і кіроўцы, аператары зернесушыльных комплексаў — усе, хто ўнёс свой уклад у агульны каравай, у суправаджэнні аркестра прайшлі праз цэнтр пасёлка да плошчы Ратушнай. На чале кожнай дэлегацыі — дзяўчына з прыгожа аформленым снапом. Найлепшых аграрыяў віталі жыхары і госці гарадскога пасёлка.



Фота grodnonews.by.

На цэнтральнай сцэне фестывалю прайшла цырымонія ўшанавання галоўных герояў «Дажынак» — хлебаробаў, якія з году ў год дэманструюць высокія паказчыкі ў рабоце. Сёлета гродзенскія аграрыі ўнеслі ў рэспубліканскі каравай 1,5 мільёна тон збожжа, што вышэй за мінулагодні вынік. Сярэдняя ўраджайнасць склала амаль 50 цэнтнераў з гектара, што вывела рэгіён у лідары. Прычым не толькі ў аграрнай галіне. Аб гэтым было сказана ў прывітальным пісьме Прэзідэнта Беларусі. «Ад усёй душы віншую хлебаробаў Гродзеншчыны з паспяховым завяршэннем уборачнай кампаніі, — гаворыцца ў пісьме кіраўніка дзяржавы. — Дзякуючы такім людзям, як вы, добрасумленным, адказным, гаспадарчым, рэгіён па праве з'яўляецца адным з прызнаных лідараў па ключавых паказчыках сельскагаспадарчай вытворчасці ў краіне і працягвае дынамічна развівацца».

Ад імя кіраўніка дзяржавы першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў уручыў узнагароды старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміру Караніку, калектыву СВК «Азёры» Гродзенскага раёна, старшыні Мастоўскага райвыканкама Андрэю Санько. Былі ўручаны Ганаровыя граматы і Падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта.

— Такі поспех невыпадковы, — адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** — За гэтым стаіць зладжаная сумесная работа, цеснае ўзаемадзеянне, здольнасць аддаваць сябе справе, працаваць з душой і сэрцам. А поўныя засекі гарантуюць упэўненасць у заўтрашнім дні. Агульнымі намаганнямі, забяспечваючы краіну натуральнай высакаякаснай прадукцыяй, беларусы гарантуюць сваю харчовую бяспеку, развіццё і стабільнасць краіны. Таму «Дажынкі» — сімвал надзейнасці і магутнасці дзяржавы.

Традыцыйна падчас урачыстасці былі ўшанаваны пераможцы абласнога конкурсу на жніве. Найлепшым стаў Гродзенскі раён (першы намеснік старшыні Генадзь Аксаміт), на другім месцы — Бераставіцкі (старшыня Антон Кулісевіч), трэцяе месца ў Шчучынскага раёна (старшыня Андрэй Садоўскі).

Сярод гаспадарак у абласным спаборніцтве найлепшымі на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур сталі тры вытворчыя кааператывы Гродзенскага раёна — СВК «Свіслач» (старшыня Васіль Густыр), СВК імя І. П. Сянько (старшыня Валерый Шумель) і ВК імя В. І. Крамко (старшыня Сяргей Крамко).

— Дзякуючы прафесійным кадрам, вобласць паспяхова вырашае ў аграрным сектары самыя амбіцыйныя задачы, — падкрэсліў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ.** — Шэсць раёнаў забяспечылі валавы намалот больш як 100 тысяч тон. Дзве гаспадаркі — СВК «Гродзенскі» і ВК імя В. І. Крамко маюць ураджайнасць звыш 100 цэнтнераў з гектара. Дзякуючы такім працаўнікам наша краіна мае дастойныя паказчыкі ў сёлетнім жніве. Разам з рапсам і кукурузай чакаем больш за 11 мільёнаў тон. Упершыню такі паказчык за ўсю суверэнную гісторыю нашай краіны.

Шматгранную збожжавую тэматыку прадставілі ўсе раёны на сваіх імправізаваных падворках. На кожным з іх — пэўная сельгаскультура. Напрыклад, Ваўкавыскі і Бераставіцкі раёны аддалі перавагу пшаніцы.

Дзятлаўскі раён прысвяціў свой падворак грэчцы. Зэльвенскі — усլаву сланечнік, а Карэліцкі — лён.

Трэба сказаць, што Вялікая Бераставіца, якая ўпершыню прымала такі салідны фестываль, прыкметна змянілася. Новае аблічча займелі многія будынкі, добраўпарадкавана набярэжная, капітальна адрамантаваны Цэнтр культуры. Праведзены рамонт вуліц, аднаўлены спартыўныя пляцоўкі.

Вялікая Бераставіца, якая сёлета прыняла эстафету фестывалю-кірмашу «Дажынкі» ад горада-спадарожніка Скідзеля, перадала яе Зэльве. Менавіта тут налета пройдзе абласное свята хлебаробаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

І мы там былі...

# Колер настрою — асенні

## У Віцебску прайшла традыцыйная абласная выстава-продаж «Восеньскі карагод»

**Абласны кірмаш устаноў адукацыі Віцебшчыны штогод збірае школы, установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі на пляцоўцы каля Палаца спорту. Сёлета нават праліўны дождж не мог збіць агульны святочны настрой — выстава-продаж была прымеркаваная да Дня настаўніка.**

Па словах **старшыні дэпутацкага корпуса вобласці Уладзіміра ЦЯРЭНЦЬЕВА,** гледзячы на багаты асартымент прадстаўленых сельскагаспадарчых вырабаў, «Дажынкі» трэба праводзіць і сярод устаноў адукацыі. «Цікава, што новенькага гэтым разам падрыхтуюць навучэнцы і педагогі. Заўсёды на восеньскім кірмашы шматлюдна, і сёння кожны знойдзе сабе нешта даспадобы», — падкрэсліў Уладзімір Уладзіміравіч.

Было ў гэты першы кастрычніцкі дзень месца для аматараў песень і танцаў, смачнага і самаробнага. Яркімі фарбамі і звонкімі песнямі ў школьныя падворкі запрашала Падзвінская гасцёўня — тут педагогі Віцебскага раёна прапанавалі свежае печыва і духмяную гарбату, майстар-класы разьбы па дрэве. У душэўнай гасцёўні арганізавалі і сваю канцэртную пляцоўку, дзе жыхарам горада на Дзвіне дарылі добры настрой творчыя калектывы раёна.

Майстры вытворчага навучання Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа запрашалі ўсіх жадаючых на ўрокі роспісу па тканіне, стварэння сувеніраў сваімі рукамі, Аршанскі дзяржаўны каледж харчавання — на майстар-клас па роспісе пернікаў, а педагогі — на шакшуку, прыгатаваную на адкрытым агні. Дарэчы, гэта незвычайная па назве страва — арабская яечня — была адаптаваная пад нашу, беларускую кухню. Кулінарнае вынаходніцтва — гэта тоўсты блін, на які зверху кладуць абсмажаны бекон і гародніну, дадаюць яйка. У нейкім сэнсе аршанскія гаспадыні цікава адаптавалі замежную страву пад нашу мачанку — такое вось мясцовае імпартазамяшчэнне.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый ХАМА** адзначыў, што правядзенне такіх мерапрыемстваў — у першую чаргу паказчык высокага ўзроўню работы ўстаноў адукацыі. А яшчэ гэта добрая пляцоўка для прафарыентацыйнай дзейнасці, дзе моладзь, гледзячы на дасягненні студэнтаў па-за межамі навучальнага працэсу, можа абраць для сябе будучую прафесію.

Прываблівалі прыгажосцю каляровыя палаткі з творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: гліняныя свістулькі і гарлачыкі, абярэгі з тканіны і пано са скуры, драўляныя ажурныя талеркі і кубачкі. І калі не з мэтай набыць, то хоць палюбавацца спыняўся кожны. Каля адной палаткі, у якую гасцінна запрашала Ларыса Жыльцова ў каларытным беларускім строі, спынілася і я. Майстар на працягу доўгіх гадоў вядзе аб'яднанне па інтарэсах «Залатая саломка» ў гімназіі № 4 горада Віцебска, няспынна, з 1978 года, перадае гэтае народнае рамяство маладому пакаленню. Па словах Ларысы Уладзіміраўны, яшчэ пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта інстытута яна моцна ўлюбілася ў саломапляценне і ўжо больш за 40 гадоў нясе гэтую любоў да народнай творчасці, жыве і дыхае сваім заняткам, перадаючы майстэрства сваім навучэнцам. Іх, дарэчы, больш за 100 чалавек, многія работы дзяцей — саламяныя конікі і павукі, карціны і лялькі — рэгулярна займаюць прызавыя месцы на конкурсах міжнароднага ўзроўню.

Рознабаковую і ўнікальную экспазіцыю разгарнуў аддзел па адукацыі Аршанскага райвыканкама: тут былі прадстаўлены і размаляваныя драўляныя дошкі для кухні, і жаночыя ўпрыгажэнні, і кампазіцыі з сухіх кветак. Дарэчы, апошнія каштавалі ўсяго 6-8 рублёў, і людзі з ахвотай набывалі для сваіх блізкіх гэтыя яркія кампліменты ў шэрую восень.




Нельга не адзначыць, што выбар садавіны і агародніны ад аграрных каледжаў быў шырокі: «Брыз», «Уладар», «Палац» — вядомыя сарты бульбы ўсяго па 80 капеек за кілаграм. Але спыняемся каля вінаграду, які, напэўна, прываблівае ўвагу аматараў садаводства больш за ўсё. Сіні, барвовы, белы; «Рэмба», «Гаральд», «Каталонія» — важкія гронкі буйных пладоў заваражвалі. Набыць у гаспадыні з Оршы Алены Мікалаеўны можна было не толькі «гатовы прадукт» — па 10 рублёў за кілаграм, — але і саджанцы. Жанчына даўно вырошчвае на аршанскіх плантацыях вінаград розных сартоў, і, улічваючы прыгажосць і памер каляровых гронак, гэта заслугоўвае павагі.

Да самага абеду не змаўкалі на святочнай пляцоўцы гукі музыкі, не зніклі пахі дзеруноў і іншых кулінарных цудаў. Кожны набываў не толькі натуральныя сельскагаспадарчыя прысмакі, кветкі ці саджанцы, але і прыемныя эмоцыі, якіх, пэўна, хопіць да наступнага «Восеньскага карагода».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Турызм

# ПОПЫТ НА АДПАЧЫНАК РАСЦЕ

## Ці гатовы да гэтага рэгіёны?

**Кожны год сусветная турысцкая арганізацыя вызначае дэвіз для прафесійнага свята. Сёлета ён заклікаў пераасэнсаваць турызм. Сапраўды, каранавірус моцна змяніў галіну. Даводзіцца працаваць у непрадказальных умовах. Усе падзеі, што адбываюцца ў свеце, адбіваюцца на тым, якія маршруты выбіраюць сучасныя падарожнікі. Але адна тэндэнцыя, якая дакладна прасочваецца за апошнія два гады, — цікавасць да ўнутранага турызму. Турысты «галасуюць рублём» і за бяспечныя маршруты, куды можна без праблем даехаць.**

У гэтым годзе назіраўся павялічаны попыт на адпачынак у Беларусі, як з боку замежных гасцей, так і айчынных турыстаў. У летні сезон не так проста было знайсці месцы ў санаторыях, гасцініцах і аграсядзібах. Былі запатрабаванымі нават тыя рэгіянальныя гасцініцы, да якіх раней турысты не даязджалі і дзе пераважна спыняліся людзі, накіроўваючыся сюды па дзелавых кантактах. Справа ў тым, што ў апошнія гады беларусы шукаюць нетрывіяльныя месцы, расце цікавасць да гісторыі невялікіх гарадоў. Новы попыт ставіць перад галіной шэраг задач, якія трэба вырашаць. Неабходна прадумаць, і як манетызаваць галіну, і як стварыць неабходную інфраструктуру. Актуалізуецца ўзаемадзеянне з музейнымі ўстановамі. Важна развіваць супрацоўніцтва з сеткамі заправачных станцый адносна турыстычнай навігацыі, распаўсюджвання праз яе інфармацыі, якая зможа спатрэбіцца падарожніку. Ствараецца сетка турыстычных інфармацыйных цэнтраў.

**Старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Піліп ГУЛЫ** звярнуў увагу на неабходнасць стварэння інструментаў, пры дапамозе якіх можна будзе збіраць інфармацыю пра турыстаў: «Без статыстыкі складана зразумець, у якім кірунку рухацца. І гэта адна з ключавых праблем: нельга некуды дайсці, калі не ведаеш, дзе знаходзішся. Мы не можам адказаць, колькі турыстаў прыбыло, праз якія каналы яны прыехалі, як былі размеркаваны, колькі патрацілі грошай».

Вялікі рост цікавасці на адпачынак у Беларусі з боку турыстаў з Расійскай Федэрацыі, ужо сёння патрабуе праапрацоўкі пытанне аб адпачынку грамадзян Беларусі, бо замежныя госці, як правіла, загадзя выкупляюць месцы ў санаторыях, гасцініцах і іншых установах. Стварэнне новых маршрутаў і турыстычных прадуктаў у пакуль не раскручаных і малавядомых кутках нашай краіны будзе дапамагаць вырашаць такую праблему і размяркоўваць турыстычныя патокі. Зноў жа рост цікавасці да рэгіёнаў з боку турыстаў — гэта шанц для развіцця лакальных прадпрымальніцкіх ініцыятыў.

**Дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ** адзначыў, што за апошнія два гады вельмі многа зроблена для развіцця ўнутранага турызму: з'явіліся новыя маршруты, праводзіліся даследаванні, сабраны метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі экскурсій на прамысловых прадпрыемствах. Асобныя даследаванні прысвечаны месцам гістарычнай памяці, звязаным з войнамі 1812 года, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай. Распрацаваны рэкамендацыі, як выкарыстоўваць гэтыя аб'екты ў межах адукацыйнага турызму. Больш актыўна выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі. Сёння многія турысты карыстаюцца такімі сэрвісамі, як анлайн-карты.

Неабходна распрацоўваць новыя формы адлюстравання гістарычнай інфармацыі, яе інтэрпрэтацыі і рэтрансляцыі. Адзін з такіх праектаў рэалізаваны на базе Рэспубліканскага саюза турындустрыі. Ён дазваляе атрымаць інфармацыю пра лагер для савецкіх ваеннапалонных, які ў гады вайны знаходзіўся ў Масюкоўшчыне. Лічбавая гісторыя, аўдыягіды, анлайн-карты — інструменты, якія могуць выкарыстоўваць індывідуальныя турысты, колькасць якіх пасля пандэміі стала павялічвацца.

Вядзецца даследаванне патэнцыялу сядзібных комплексаў. Сёння, напрыклад, багата турыстаў ужо прыязджае ў Залессе ці Чырвоны Бераг, але вялікая колькасць старадаўніх сядзіб пакуль застаюцца незапатрабаванымі, невядомымі турыстам. Такія комплексы можна было б задзейнічаць пры распрацоўцы новых маршрутаў, нават калі аб'екты патрабуюць рэстаўрацыі. У той час пакуль яна не зроблена, можна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі, напрыклад дапоўненай рэальнасці, або рабіць анімацыі, звязаныя з гісторыяй гэтых мясцін, на тэрыторыі побач з сядзібай. У сваю чаргу такая актыўнасць і цікавасць да гістарычнага аб'екта з боку турыстаў можа прывабіць патэнцыйных інвестараў, гатовых узяцца за аднаўленне будынкаў.

**Ганна ПЯТРОВА.**

---

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении **3 ноября 2022 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42** | | | |
| 1 | Спектроденситометр X-Rite eXact Advanced NGHXRC40E апертура 4mm, серийный номер 000722, инвентарный номер 2994, 2013 год выпуска | 2 520,00 | 252,00 |
| 2 | Программное обеспечение Ink Form. 6 PrinterPro, ID 223185599, IF s/n 122575, 2018 год выпуска | 7 440,00 | 744,00 |

**Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз»**, Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Контактный телефон +375 29 655 50 51.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 02.11.2022 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже имущества юридического лица, находящегося в процессе ликвидации

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00114** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г.п. Копысь, ул. Октябрьская, 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов 19 октября 2022 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Установка для штабелирования досок (за один участок штабелирования), инв. № 645.

**Нач. цена:** 128 484,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 12 848,40 бел. руб.

Лот № 1 находится по адресу: **Витебская обл., Оршанский р-н, г.п. Ореховск, Ленина, 36.**

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: до 16.00 18.10.2022.**

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

***Суммы задатков по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код операции: 40901.***

Условия повторных электронных торгов: Победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by. Имущество, бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна, +375292953541.

---

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского РайПО (продавец) извещает о проведении **14 октября 2022 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества **в 12.00** по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Задаток без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 311/С-35724 площадью 477,3 кв. м, наименование: здание магазина с административным помещением, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Советская, 36. Заключен договор аренды № 28 от 05.07.2021 г. и № 2 от 27.01.2022 г. В состав лота входит торговое оборудование в неисправном состоянии, список опубликован на сайте www.deloocenka.by | 34 200,00 | 3 420,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52106 площадью 194,0 кв. м, наименование: Книжный магазин, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Советская, 36/1 | 5 940,00 | 594,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52038 площадью 294,8 кв. м, наименование: магазин, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. Советская, 36/2 | 26 910,00 | 2 691,00 |
| Лоты №№ 1, 2, 4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 321255700001000569 площадью 0,6512 га (право постоянного пользования) | | | |
| Расходы по изменению границ земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона; приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона | | | |

**Продавец: Добрушское районное потребительское общество**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел. +375 29 690-00-10.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.10.2022 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %.

Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену.

Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

---

**ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»** извещает, что внеочередное общее собрание акционеров состоится **14 октября 2022 года** по адресу: **г. Минск, ул. Фабрициуса, 2**

Начало собрания **в 10.00.** Регистрация акционеров **с 9 часов 30 минут до 9 часов 55 минут.**

При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

О предоставлении права на подписание со стороны Общества договора на оказание услуг по управлению коммерческой организацией (передачу полномочий исполнительного органа) с УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт».

***Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт». Тел. 282-57-57***

УНП 600013173

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**

организатор торгов по продаже имущества Частного предприятия «КРЕОЛА ПЛЮС» (УНП 790850154), объявляет о проведении **18.10.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Адрес нахождения имущества: **г. Бобруйск, ул. Ново-Шоссейная, 47А.**

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

Гарадское асяроддзе

# ДРЭВЫ ЯК МАШЫНЫ ЧАСУ

## Сведкамі якіх падзей маглі быць дубы-старажылы ў гістарычным цэнтры Гродна?

**Адказ на дадзенае пытанне з'явіўся пасля таго, як былі абследаваны самыя старыя дрэвы горада. Знаходзяцца яны каля знакавых гістарычных будынкаў і ў цэнтральным парку. Іх дакладны ўзрост устанавілі спецыялісты кафедры батанікі ГрДУ імя Янкі Купалы сумесна з калегамі Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі. Аказалася, што дрэвы не толькі могуць быць сведкамі гісторыі горада, але і самі здольныя прэтэндаваць на статус помнікаў прыроды.**

### ПАРКАВЫ СТАРАЖЫЛ

Для таго каб вызначыць узрост дрэва, патрэбная спецыяльная прылада — керн. Гэта доўгі металічны бур з асобай сталі. Каштуе даволі дорага — некалькі тысяч рублёў, хоць па выглядзе не скажаш. **Загадчык кафедры батанікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Алег СОЗІНАЎ** дэманструе прыладу ў дзеянні:

— Бачыце, унутры бур пусты. Што мы робім? Укручваем яго ў дрэва да цэнтра, вымаем, і ў жолабе з'яўляецца доўгі драўляны цыліндр. Па гадавых кольцах і вызначаем абсалютны ўзрост дрэва. Іншых варыянтаў няма.

Такім чынам дрэва атрымлівае свой пашпарт. І ён, трэба сказаць, даволі змястоўны. Па атрыманым матэрыяле можна прасачыць усё жыццё дрэва: суседства з іншымі пародамі, тагачасны клімат, якія шкоднікі маглі ў ім быць, калі былі пажары і многае іншае. Гэтую інфармацыю можна расшыфраваць падэкадна дзякуючы навуцы — дэндрахраналогіі. Практычны аналіз праводзіцца ў спецыяльнай лабараторыі НАН Беларусі.

Мы знаходзімся ў цэнтральным гарадскім парку каля старога ясеня. Па словах навукоўца, дрэву гадоў 140 і яно ў добрым стане. Ствол па перыметры крыху больш за тры метры, а вышыня — роўна сорак метраў. Падобны ясень расце і за некалькі дзясяткаў метраў. Відаць, яны высаджваліся ў 1880-я гады для азелянення парку. У гэты перыяд гродзенскім губернатарам быў Аляксандр Пацёмкін, дарэчы, зацікаўлены ў будаўніцтве летняга тэатра ў тагачасным гарадскім садзе. Сам парк быў закладзены значна раней французскім батанікам Жанам Жылібeрам. Асновы яго склаў батанічны сад. Тут раслі рэдкія прадстаўнікі флоры, прывезеныя з Ліёна. Многія добра прыжыліся на гродзенскай зямлі. Праз тры гады пасля стварэння сад лічыўся адным з найлепшых у Еўропе, тут налічвалася дзве тысячы відаў. Але пасля таго, як Жылібер пакінуў горад, яго калекцыя была вывезена ў Вільню, а парк прыйшоў у заняпад. Магчыма, пасадка ясеняў была спробай запоўніць апусцелы парк.



### РАВЕСНІК ЖЫЛІБЕРА?

Да гэтага часу існуе легенда, што засталося дрэва — равеснік парку Жылібера, а значыць, яму павінна быць не менш за 250 гадоў. Праўда, на сёння ад дрэва застаўся толькі вялікі трухлявы пень і вызначыць яго ўзрост немагчыма. Ясень прызналі аварыйным і спілавалі. Рэшткі пакінулі, і выглядаюць яны вельмі велічна. А ў цэнтр гэтага пня пасадзілі новы ясень.

— Ідэя добрая. Мы сімвалічна саджаем ясень унутры старога. Але, на жаль, не ўлічылі відавую асаблівасць дрэў. Можна было высадзіць менавіта той від, які тут рос, а не замяняць яго на іншы, — лічыць суразмоўнік і выказвае сваю прапанову: — Трэба, каб было больш інфармацыі аб дрэвах. У парку не хапае гісторыі. Гэта цэнтр горада. Тут бывае шмат турыстаў, ды і самім гараджанам было б цікава даведацца аб дрэвах у гістарычным кантэксце: што адбывалася ў той перыяд, калі іх высаджвалі, якая гэта была эпоха, чым адметная. Бо такія дрэвы — своеасаблівая машына часу. Яны даюць шмат інфармацыі аб тым, што адбывалася навокал. Можна і легенды нейкія ўспомніць.

### ПАЛАЦ ПАД ШАТАМІ ДУБОЎ

Інфармацыйныя шыльдачкі ўжо з'явіліся каля двух дубоў звычайных, якія растуць на тэрыторыі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Іх устанавілі самі супрацоўнікі музея. Пры даследаванні было падлічана, што аднаму дубу амаль 130 гадоў, другому — 150. Абодва растуць каля Новага замка. Узрост дубоў адсылае нас да эпохі Расійскай імперыі. У гэты час у палацы размяшчалася ваеннае ведамства — спачатку кадэцкі корпус, затым — ваенны шпіталь. Магчыма, дрэвы былі пасаджаны кадэтамі. Сам Новы замак будаваўся ў сярэдзіне XVIII стагоддзя як летняя рэзідэнцыя караля, тут праводзіліся генеральныя сеймы, у тым ліку і знакаміты Маўклівы сейм, у выніку якога Гродна пераўшло ў склад Расіі. Так што дубы — сведкі многіх гістарычных падзей у горадзе. У савецкі час у былым палацы месціўся абкам партыі, а цяпер будынак уваходзіць у склад гісторыка-археалагічнага музея.

Дуб, якому за 150 гадоў, знаходзіцца ў цэнтры двара. У абхваце ён дасягае 370 сантыметраў, яго вышыня 23,5 метра, стан ацэньваецца як адносна добры, бо навукоўцы выявілі зачаткі гніення ў стрыжні. Але прастаіць ён яшчэ не адно дзесяцігоддзе, лічыць Алег Созінаў.

Дарэчы, як і другі даследаваны дуб на тэрыторыі палаца. Праўда, ён крыху маладзейшы за свайго «калегу» і мае 129 гадоў. З улікам узросту, гэты дуб з'явіўся тут у пачатку 1890-х, а старэйшы — у 1871 годзе.

— Дубы растуць марудна, таму не так хутка старэюць, як, напрыклад, таполі, якія хутка растуць, — канстатуе суразмоўнік. — Між тым, дубам часта прыпісваюць большы ўзрост, чым ёсць на самай справе. І многія паданні аб старых дубах, якім па 500-600 гадоў, далёкія ад рэальнасці. Гэта фантазія. Пакуль не прабуршыш, узрост дрэва не вызначыш. З праверамных дрэў старажылы маюць не больш за 400 гадоў. Хоць дубы сапраўды могуць расці і да тысячы гадоў.

Дарэчы, многія «ўзроставыя» дрэвы маюць дзяржаўны статус помнікаў прыроды, своеасаблівую «ахоўную грамату». Па словах Алега Созінава, на Гродзеншчыне такіх нямала ў парках старажытных сядзіб. Напрыклад, у Свяцку, Уселюбе, Вердамічах, Руткевічах, Шчорсах. Ёсць дрэвы-доўгажыхары, якія выраслі самі, іх не садзіў чалавек. Гэта знакамітыя дубравы ў заказніках «Азёры», «Ліпічанская пушча», «Замкавы лес», на возеры Свіцязь. Цікавыя аб'екты ў плане дрэў-старажылаў знаходзяцца ў вёсцы Горні Лідскага раёна — там дрэвы-веліканы падпісаны, аб іх размешчана інфармацыя.

У заказніку «Азёры» дрэвам па 150—225 гадоў, яны вышынёй 40 метраў, што адпавядае 12-павярховіку.

А вось з узнаўленнем дубоў ёсць праблема, бо маладыя дубкі адчувальныя да замаразкаў. Не кожны дуб мае статус помніка прыроды. Адна з умоў — дрэва павінна быць не менш за 1,5 метра ў дыяметры. У гэтую катэгорыю, дарэчы, траплюяюць і «замкавыя» дубы ў Гродне. Абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя будзе разгледжана пытанне па наданні дрэвам статусу помнікаў прыроды мясцовага значэння.

### ТАПОЛЯ І ЛІПА НА КАНТРОЛІ

Падчас даследаванняў была звернута ўвага і на старую ліпу ў Швейцарскай даліне горада. Абхват ствала яе — 275 сантыметраў, а вось узрост — усяго 75 гадоў. Пры гэтым наяўнасць значнай гнілі ў цэнтры дрэва патрабуе кантролю. Па разліках, ліпу саджалі ў першыя пасляваенныя гады. Гэта сведчыць аб тым, што ў горадзе не толькі аднаўлялі будынкі, але і надавалі ўвагу азеляненню. Дарэчы, многія дрэвы ў цэнтры горада высаджваліся менавіта ў першыя пасляваенныя гады. Да гэтага перыяду адносіцца і канадская таполя ў парку Жылібера. Яна самая тоўстая з усіх абследаваных дрэў, яе абхват — 476 сантыметраў, а вышыня — 35 метраў. Гарадское асяроддзе значна паўплывала на яе стан. Навукоўцы зрабілі заключэнне, што дрэва аслабленае, каля падножжа ёсць вялікае дупло. Таму яго занеслі ў спіс небяспечных з-за рызыкі падзення. Пакуль далейшы лёс таполі не вызначаны.

Як расказалі ў лесагаспадарчым аб'яднанні, каля дрэў-старажылаў у Гродне будуць устаноўлены адпаведныя шыльды з іх назвамі і ўзростам. Магчыма, будзе распрацаваны і турыстычны маршрут, звязаны з інтэрактыўным музеем лесу, які размясціўся ў старажытным будынку былой лясной адміністрацыі ў цэнтры горада.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

### ❍ У тэму

У гарадскім парку з'явіўся куток адраджэння былой калекцыі яго заснавальніка Жана Жылібера. Там растуць ядомыя каштаны, айва, магонія, птэлея, лапіна, дэйцыя, яблыня Зібальда і іншыя экзоты. Летась у Швейцарскай даліне высаджана паўлоўнія. Яна цвіце буйнымі блакітна-фіялетавымі суквеццямі. Таксама будзе высаджана метасеквоя, якую Алег Созінаў прывёз з Батанічнага інстытута Санкт-Пецярбурга разам з рэдкім дрэвам гінкга. Дарэчы, яго саджанец вырас з насення, якое ўзята з 850-гадовага свяшчэннага дрэва ў Японіі. Атрымліваецца, дрэва «з радаслоўнай». Ёсць у парку цюльпанавае дрэва, лісты якога нібы абгрызеныя. Гродзенскія біёлагі чакаюць, калі яно зацвіце.

Камунальныя тэхналогіі

# Супраць пластыкавых астравоў

**Сусветнае спажыванне пластыку кожны год дасягае 300 мільёнаў смеццевых тон — гэта прыкладна столькі ж, колькі важыць усё насельніцтва Зямлі. А з моманту вынаходніцтва чалавецтвам пластыку як матэрыялу створана ўжо 8,3 млрд тон палімераў. 79 % з іх трапілі на палігоны ці апынуліся ў навакольным асяроддзі. Больш за 80 % смецця ў акіяне — менавіта пластык — і на гэтых пластыкавых астравах магло б размясціцца ўжо амаль 70 Беларусяў. Як шукаць паратунак ад пластыкавага забруджвання, прапануюць беларускія вучоныя.**

Адзін з магчымых варыянтаў барацьбы з пластыкавым смеццем — выкарыстанне біяраскладальных палімераў, якія здольныя ў нармальных умовах (пры пэўнай вільготнасці і тэмпературы і з дапамогай мікраарганізмаў) цалкам раскладацца, пакідаючы пасля сябе вуглякіслы газ і ваду. Аднак у свеце за год вырабляецца толькі каля двух мільёнаў тон біяраскладальных палімераў — гэта менш за працэнт ад агульнай колькасці ствараемых палімераў, расказаў **Аляксандр РАГАЧОЎ, дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі**.

Пераход на біяраскладальную ўпакоўку і адыход ад пластыкавай дазволіць больш як на 10 % зменшыць аб'ём палімерных адходаў, якія ў марфалогіі смецця ў Беларусі складаюць да 12 %, лічыць і **Вадзім КІЦІКАЎ, дырэктар Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі**. Ён расказаў, што ў свеце існуе сем лабараторый, дзе ацэньваецца біяраскладальнасць матэрыялаў. Пяць з іх у Еўропе, і такую ж цяпер будуюць у Беларусі:

— Неабходна забараняць асобныя віды ўпакоўкі і абмяжоўваць яе колькасць. Мэтазгодна таксама распрацаваць нацыянальны план канцэпцыі па ўпакоўцы і развіцці ўпакоўчнай галіны.

Айчынныя вучоныя ў сферы выкарыстання біяраскладальных палімераў працуюць над стварэннем кампазітных матэрыялаў. Задача спецыялістаў — зменшыць пры стварэнні прадукцыі прысутнасць дарагога пластыку і замест яго выкарыстаць іншую даступную сыравіну. У некаторых вытворчасцях яна з'яўляецца адходамі, аднак не дабаўленне дазваляе захаваць біяраскладальныя ўласцівасці палімераў, заўважыў Аляксандр Рагачоў.

Штогод у Беларусі вырабляецца 280 тысяч тон палімераў. Большасць з гэтай колькасці — упакоўка, якой кожны беларус за год выкарыстаў 14,7 кілаграма. Каб зменшыць колькасць шкодных палімераў, трэба карыстацца біяраскладальнай тарай, раяць эксперты.

Ацэнка біялагічнай раскладальнасці ўпакоўкі ўключае ў сябе пяць стадый. Гэта вызначэнне параметраў упакоўкі і ўпакоўчнага матэрыялу, біяраскладальнасць, распад, якасць кампосту і распазнавальнасць, расказала **Марыя КУДРЭВІЧ, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута ЖКГ НАН Беларусі**.

Каб упэўніцца, што матэрыял падвяргаецца раскладанню падчас кампаставання і не пакідае бачных фрагментаў, неабходна, каб рэальны працэс кампаставання пры зададзеных умовах цягнуўся не больш як 12 тыдняў. Гэта праверка стадыі фізічнай дэструкцыі (распаду) матэрыялу. У працэсе матэрыял пераварочваюць і правяраюць паказчыкі тэмпературы, вільготнасці, утрымання кіслароду.

— Пасля завяршэння атрыманы матэрыял прасейваюць праз сіта, — удакладніла спецыяліст. — Часцінкі, якія па памерах больш за 2 мм, лічацца тымі, што не распаліся. Іх колькасць не павінна перавышаць 10 % ад зыходнай масы. Наступная стадыя — праверка якасці кампосту. Апошняя стадыя датычыцца ўпакоўкі. Яна павінна мець такую ідэнтыфікацыю і маркіроўку, каб карыстальнік мог вызначыць здольнасць матэрыялу да кампаставання і біялагічнага раскладання. Для біяраскладальных матэрыялаў існуюць



лагатыпы, якія сертыфікаваны згодна са стандартам EN13432, — па іх можна вызначыць, ці з'яўляецца ўпакоўка біяраскладальнай. У Беларусі няма ідэнтычных еўрапейскаму стандартаў, таму неабходнае стварэнне нацыянальнай сістэмы ацэнкі і сертыфікацыі біяраскладальных матэрыялаў і ўпакоўкі.

Між іншым у Беларусі буйныя крамы ўжо прапануюць пакупнікам біяраскладальныя пакеты трох відаў: пакет-майка для тавару, фасовачны пакет для гароднiны і пакет для смецця. Усе яны не проста здольныя раскладацца, але і могуць выкарыстоўвацца разам з арганічным смеццем для кампаставання.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Людзі глыбінкі

# Буса жыве памяццю

**Амаль 65 гадоў таму ў агні загінула 65 жыхароў палескай вёскі Буса. У 1944-м яе палілі немцы. Пётр Навумчык усё жыццё клапоціцца аб падтрыманні памяці пра трагедыі і землякоў**

**З Пятром Іосіфавічам мне давялося пазнаёміцца роўна дваццаць гадоў таму, калі адзначалася 45-я гадавіна пажару. Тады прайшло ўсяго пяць гадоў, як з матэрыялаў крымінальнай справы знялі грыф «Зусім сакрэтна», пра трагедыю напісалі ў СМІ. На месцы гібелі людзей паставілі новы помнік, 11 лістапада 2002 года ў Бусе правялі жалобнае мерапрыемства.**

## Самае страшнае кіно мінулага стагоддзя

Тады ў вёсцы жыло яшчэ нямала відавочцаў, такіх як Соф'я Сідарчук, Сцяпан Навумчык. Яны ў падрабязнасцях памяталі той дзень, перадавалі гэтую памяць сваім дзецям. Хіба ж можна забыць хлопчыка, які звесіўся ў аконным праёме і крычаў: «Ратуй мяне, мамачка, я больш ніколі не буду хадзіць у кіно!»? Выцягнуць яго аказалася немагчыма. Збітыя ў натоўп людзі намертва прыціснулі ногі дзіцяці і яго апошнюю надзею на паратунак. А стогн маці, звар'яцелай ад таго, што не можа вызваліць з вогненнай прорвы свайго сыночка, хоць ён зусім побач — вось яго рукі, галава, ён яшчэ жывы, гаворыць, — той стогн, здавалася, прайшоў усю акругу, прарэзаў паветра да нябёсаў... Потым яна пахавала свайго хлопчыка.

Вечарам 11 лістапада 1957 года вяскоўцы сабраліся ў невялікай зале мясцовай школы, дзе звычайна паказвалі кіно. Паводле сведчанняў відавочцаў, у пакой, які можа ўмясціць усяго 50—60 гледачоў, набілася чалавек сто. Напярэдадні вісела афіша, якая запрашала на прагляд фільма пра Брэсцкую крэпасць. Праз 12 гадоў пасля Перамогі цікавасць да тэмы вайны была велізарная, усе хацелі паглядзець гэтую стужку.

Кінаапаратура стаяла побач на стале. Меншыя гледачы сядзелі на падлозе перад самым экранам. Пайшлі першыя кадры. І людзі ўбачылі, што фільм ім прывезлі зусім іншы. Карціна называлася «Хлопец з тайгі». Каб раней ведалі, многія, хутчэй за ўсё, засталіся б дома. Але ж як прыйшлі, то сталі глядзець. Прайшла хвіліна-другая, і плёнка абарвалася. Кінамеханік папрасіў пасвяціць яму лямпай — электрычнасці ў тую пару ў Бусе яшчэ не было. А газоўку перад гэтым па злашчасным збегу акалічнасцяў заправілі бензінам. Лямпу знялі, пасвяцілі. Затым павесілі назад на кручок. Аднаго нязграбнага руху хапіла, каб яна ўпала, разбілася, і кінаплёнка ўспыхнула як порах.

Людзі кінуліся да вокнаў. Калі іх разбілі, прыток паветра толькі ўзмацніў полымя. Хто быў бліжэй да акна, паспеў выскачыць. Астатнія ў таўкатні, справакаванай панікай, у лічаныя хвіліны задыхнуліся ад пароў сінільнай кіслаты. Як пазней устанавіла судова-медыцынская экспертыза, прычынай смерці сталі не апёкі, а атручэнне прадуктамі гарэння нітраплёнкі. Бо нават малая доза сінільнай кіслаты ў арганізме чалавека выклікае незваротныя працэсы.

## Праводзіны юнацтва і надзеі вёскі

Словам, дасталі з пажарышча 63 целы, яшчэ два чалавекі памерлі ў бальніцы праз колькі дзён. Загінулі цэлымі сем'ямі: бацька і два сыны, маці і сын, дачка і бацька. Самай маленькай ахвяры трагедыі было восем гадоў. Абсалютную большасць гледачоў складалі дзеці і падлеткі. 50 чалавек з 65 былі маладзейшыя за 20 гадоў. Юнацтва і надзея вёскі за лічаныя хвіліны пайшлі ў вечнасць па недарэчнай выпадковасці.

Затым было пахаванне. Маракі Пінскай флатыліі выкапалі траншэі на могілках і памаглі правесці неабходны абрад. У вёсцы не было ніводнай сям'і, дзе б не аплаквалі сваіх нябожчыкаў. Стогн стаяў, здавалася, па ўсёй зямлі. Вёска стала як мёртвая. Расказвалі, што сабакі вылі тыдзень, а можа, і два. У Бусе жыццё быццам спынілася. Жыхары, правільней сказаць, астаткі сем'яў, збіраліся разам — так лягчэй было перажываць цёмныя тужлівыя вечары. Людзі доўгі час былі ў стане шоку, многія не знаходзілі адказу на пытанне, як жыць далей. Згаданай мной Соф'і Сідарчук раней здавалася, што адмераную лёсам чашу гора і пакут яна выпіла да дна. Не вярнуўся з фронту муж, памёр ад хваробы прыёмны сын. Адно святло ў акенцы засталося — дачушка Надзейка, яе ўжо маці песціла... Не паспела ўсвядоміць, паверыць да канца, выкрычацца, як яе крывіначку панеслі разам з усімі ў агульную магілу... Казалі, што да канца жыцця маці плакала кожны дзень. Праз 45 гадоў разам з усёй вёскай непаслухмянымі нагамі прыйшла бабулька Соня да помніка.

## Маральны абавязак жывых

Цяперашні мой суразмоўца Пётр Навумчык у зале не аказаўся выпадкова. І хацеў жа пайсці ў кіно, ды маці паслала з тэрміновым даручэннем да цёткі. У тую страшную ноч ён страціў бацьку і сястру. У 12 гадоў стаў галавой сям'і, асноўнай рабочай сілай у доме. У школу нават не пайшоў у год пажару. Потым экзамены за сямігодку здаваў экстэрнам. Пётр Іосіфавіч лічыць, што жыццё склалася б па-іншаму, каб быў бацька. Апошні хацеў бачыць дзяцей адукаванымі. А пасля пажару ўжо стала не да навукі. Але ж пражыў сваё жыццё годна, шмат працаваў, стварыў сям'ю з аднавяскоўкай Ганнай. Выгадавалі дзвюх дачок, маюць унукаў, праўнукаў.



Помнік абаронцам Радзімы ў пачатку вёскі.



Ахвяры пажару 1957 года.

Ды памяць пра трагедыю не давала ніколі спакойна жыць. І недзе ў канцы 90-х, калі Пятра Навумчыка абралі старастам вёскі, ён пачаў бударажыць грамадскасць наконт устаноўкі новага годнага помніка. Першы помнік з цэглы з'явіўся на месцы пажарышча ў 1958 годзе. Яго пабудаваў мясцовы ўмелец Мікалай Вырвіч. Аб тым, каб атрымаць нейкую дапамогу на ўвекавечанне, гаворка не ішла наогул. Інфармацыю пра пажар засакрэцілі, жалобу ніхто не аб'яўляў. Толькі замежныя радыёстанцыі перадалі звесткі пра пажар, суайчыннікі ва ўсім Савецкім Саюзе нічога не ведалі пра трагедыю невялікай палескай вёскі. Праўда, на закрытым пасяджэнні Сакратарыята ЦК КПСС было прынята рашэнне поўнасцю адмовіцца ад выпуску таннай нітратнай кінаплёнкі. Так што цалкам верагодна, што жыхары Бусы сваёй ахвярай выратавалі некага ад такой жа трагедыі.

— Не сумняваюся, што мне наканавана займацца сербістыкай і югаславістыкай як справай жыцця. Хоць на розных этапах успрымаць гэта можна было па-рознаму. Уласна, я ж не атрымліваў адукацыі канкрэтна па гэтай спецыяльнасці. Проста на другім курсе рускага і беларускага аддзяленняў філфака БДУ быў прапанаваны факультатыў па адной са славянскіх (замежных) моў. Паколькі на яго было адведзена ўсяго 32 вучэбныя гадзіны, то прадугледжваўся ён, фактычна, для агульнага знаёмства з гэтай мовай. Я без ваганняў выбраў сербскую, лёгка асвойваў яе асаблівасці, хоць і не вылучаўся дысцыплінаванасцю, стараннасцю. Атрымлівалася анекдатычная сітуацыя: паколькі я прапускаў заняткі, выкладчыца лічыла непедагагічным ставіць мне залік гэтаксама, як і маім руплівым аднагрупнікам, хоць я валодаў ведамі і навыкамі лепш за іх. Тады я сам выручыў інтэлігентную, сумленную выкладчыцу — прапанаваў, каб яна прызначыла мне пераздачу, даўшы нейкае сур'ёзнае заданне. І выйшла так, што на пераздачы я атрымаў прапанову стаць гідам-перакладчыкам у Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік». Пасля гэтага для мяне адкрыліся магчымасці не проста падпрацоўваць: я пачаў ездзіць з групамі югаслаўскіх турыстаў па ўсім Савецкім Саюзе, наведваць мясціны, культурна-гістарычныя аб'екты і музеі, якія б сам па сабе наўрад ці ўбачыў, за гэта маючы заробак і прыстойнае харчаванне. Да таго ж мне, як усім астатнім студэнтам, стыпендыя ішла, я карыстаўся правам на вольнае наведванне заняткаў, на індывідуальны перанос экзаменаў і залікаў... І так больш за тры гады. Але пакуль што я не згадаў пра самае важнае — проста выдатныя шанцы ўдасканальваць мову і веды пра краіну, а таксама пра народ, з прадстаўнікамі якога даводзілася непасрэдна і цесна кантактаваць. Дзякуючы гэтаму пазней я стаў запатрабаваным як у функцыі перакладчыка югаславянскіх літаратур, так і кансультанта па югаславістыцы для выдавецтваў і навуковых устаноў. Між тым, не ўсё складвалася ідылічна. Калі ўжо аказаўся на этапе «прасунутым» і развівацца як спецыяліст не мог без паездак у краіну маіх навуковых і творчых інтарэсаў, узніклі істотныя перашкоды. СФРЮ ж лічылася дзяржавай апартуністаў. З часам выявілася, што мне выезды не дазваляюцца, хоць адкрыта пра гэта ніхто не гаворыць, а я дзясятак разоў марна афармляю дакументы на семінары, канферэнцыі, стажыроўкі. Працягвалася такое даволі доўга. З дыстанцыі цяперашняга ўзросту маю падставы лічыць, што гэта мела і станоўчае значэнне. Галоўнай прычынай названай перашкоды з'явілася беспартыйнасць. Адпаведна, трэба было прайсці спакусу, нават рэальнае выпрабаванне — уступаць у партыю, каб пазбавіцца статусу «невыязнога», ці ўсё ж такі трываць? Выбраў другое, працягваючы займацца сваёй справай. Аказалася, што раней ці пазней такія пытанні ўсё роўна вырашаюцца, за кошт вынікаў справы.

А што да асоб, якія ўплывалі на мой шлях, да іх перш за ўсё належыць незабыўная Вера Міхайлаўна Лумбіна, выкладчыца сербскай мовы. Лёс яе не назавеш звычайным: нарадзіўшыся, вырасшы і атрымаўшы адукацыю ў Сербіі, у сям'і тых, хто пакінуў Расію пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, яна вымушана была перажыць тое ж самае, што і бацькі, толькі стала выгнанай з другой радзімы і аказалася ў рээміграцыі. Такі вынік канфлікту ФНРЮ з СССР. Адпаведна, большую частку і завяршэнне жыцця Вера Міхайлаўна правяла ў Мінску, працуючы ў бібліятэцы Акадэміі навук БССР, падпрацоўваючы на філфаку БДУ, дзе мы і сустрэліся з ёю.

Спрыяльным стала знаёмства з прафесарам літаратуразнаўства Вукашынам Станісаўлевічам якраз у той час яшчэ, калі я вазіў па Саюзе групу бялградскіх студэнтаў, а ён гэтую групу ўзначальваў. А пазней, калі ўдалося-такі апынуцца ў СФРЮ, усталяваліся прыязныя кантакты з вучонымі-філолагамі і культуролагамі, сярод якіх галоўнае месца займае прафесар Міядраг Сібінавіч, побач з ім — Вітамір Вулеціч, Сава Бабіч, Радэ Канстанцінавіч, Ёван Янічыевіч і многія іншыя. Тое ж самае з пісьменнікамі, паколькі шэраг маіх выездаў адбываліся праз СП СССР. Я меў гонар і задавальненне добра ведаць пісьменнікаў-класікаў — скажам, Дэсанку Максімавіч, Антоніе Ісакавіча, Слабадана Ракіціча.

**«Я неаднойчы ўжо казаў і пісаў, што веру кожнага з нас выявіць сам Гасподзь. І выявіцца яна, бадай, не толькі ў тым, ці часта мы ў царкву хадзілі, ці насілі асвячаць на Вербніцу вярбу, ці фарбавалі на Вялікдзень яйкі...»**

***— Ведаю, што даводзілася часта гасцяваць у Сербіі... Што падаецца агульным і адрозным у сербаў і беларусаў? Мо якую страву адтуль запазычылі для сямейнага стала?***

— Сапраўды, з 1982 года я стаў рэгулярна ездзіць у Югаславію, а найбольш — у Сербію, якая мне блізкая, па-свойму родная. Прызнаюся, што тамтэйшыя сябры нярэдка называюць мяне «беласербам», ужываючы слова, утворанае і выкарыстанае мною сітуатыўна. Між тым, сербскія стравы да гэтага не маюць дачынення, хоць нацыянальная кухня ў братоў-сербаў проста цудоўная. Не кажу ўжо пра віно і ракію... Але я не гурман і нават не вялікі ахвотнік многа есці. Таму часта натыкаўся на недаўменне, калі не сказаць, крыўду: «Чаму ты гэта не пакаштуеш? Чаму вось тое не пахваліш — што, не падабаецца?!» Мяне як беларуса, які гадаваўся пры абмежаванасці ва ўсім, проста не цікавілі прысмакі, часам нават сам па сабе вырываўся не зусім дыпламатычны папрок, што ў адносінах да ежы яны выяўляюць нешта ад язычніцтва. А ўжо мая жонка, калі мы ездзілі разам, заўжды станоўча адзывалася пра розныя гастранамічныя «спецыялітэты», як гэта сербы называюць, і хваліла іх.

Вось вам і першае сведчанне пра тое, чым мы адрозніваемся. Праўда, павінен удакладніць, што ўспомнены вышэй папрок з намёкам на язычніцтва несправядлівы, хоць яго можна абгрунтоўваць і некаторымі іншымі паказчыкамі — напрыклад, шырокай распаўсюджанасцю імёнаў тыпу Весна, Ружа, Ела (елка) і нават Вук (воўк). У сапраўднасці сербы — глыбока хрысціянскі народ. І галоўны іх запавет, Касоўскі, грунтуецца на адназначнасці выбару паміж царствам зямным і Царствам Нябесным. Мала хто звяртае таксама ўвагу на тое, што ў сербаў ёсць сваё найменне Праваслаўя — Святасаўе, ад імені святога Савы, першага архіепіскапа Сербскай праваслаўнай царквы, якая ўзнікла непасрэдна дзякуючы яму.

***— Добра, тады возьмем такі канкрэтны і зусім прыватны план: якая сербская народная казка з перакладзеных вамі вам найбольш падабаецца?***

— Мне, натуральна, даводзілася не толькі чытаць, але і перакладаць мноства казак сербаў ды іншых народаў Югаславіі. Дарэчы, укладаць зборнік беларускіх казак для сербаў давялося таксама. Але вылучыць нейкія асобныя з іх мне цяжка. Акрамя таго, перад унукамі, бадай, мушу і павініцца за тое, што казкі ім расказваў вельмі рэдка, а пры гэтым яшчэ і «халтурыў» — стараўся, каб хутчэй выходзіла як мага карацей. Гэта, прызнаю, не мая стыхія. Мне заўжды больш хацелася ўнукам паспяваць, і я спяваў, сербскія песні ў тым ліку. Ну а калі дачакаюся праўнукаў, то ўжо і на казкі згаджуся...

***— Колькі ж моў вы ведаеце і наколькі вольна імі валодаеце?***

— Вывучаць давялося больш за тузін. А наконт узроўняў валодання мовамі я публічна выказваўся не адзін раз. Магу паўтарыць і яшчэ: той, хто сцвярджае, быццам свабодна валодае многімі мовамі, альбо падманвае, альбо сам падманваецца. Тут дзейнічаюць складаныя механізмы. І нават калі ты раней гаварыў зусім лёгка, без ніякіх цяжкасцяў, адсутнасць моўнага асяроддзя і актыўнай практыкі заўжды дае свае вынікі. Я, апынаючыся ў Сербіі, маю патрэбу, каб «вуха адкрылася» — чуць не толькі словы, але і ўсе інтанацыі, нюансы; затым каб па-сапраўднаму «раскрыўся рот» — без дадатковага кантролю спрацоўваў маўленчы апарат. А ёсць і яшчэ этапы — напрыклад, калі ў сне размаўляеш... Ды гэта ўжо сур'ёзная псіха-лінгвістычная праблематыка.

**«Глыбокае ўсведамленне спрадвечнай існасці павінна закладваць аснову для быційна патрэбных высноў, а таксама для вызначэння жаданых перспектыў. Без гэтага немагчыма фармуляваць як звязанае з універсальнымі катэгорыямі, так і, скажам, з актуальнай ідэалогіяй — і нацыянальнай, і дзяржаўнай. Натуральна, пры максімальным уліку гістарычнай памяці».**

***— Вядома, ды і з таго, як вы характарызавалі сербаў, заўважна, што вы — чалавек веруючы... Якія традыцыі склаліся ў сям'і, як адзначаеце святы?***

— Вой, на такое пытанне адказваць надзвычай складана! Як цяпер ні паварочвай, а варта прызнаць, што традыцыі набожнасці ў сем'ях, а тым больш у шырэйшым ахопе, абарваліся пры савецкай уладзе з яе татальным бязбожніцтвам. І вяртацца да іх вельмі няпроста. Наша грамадскае асяроддзе па інерцыі ўсё яшчэ пад моцным уплывам ранейшага. Дзякуй богу, што цяпер больш выяўляецца свядомасць проста атэістычная, а не антытэістычная ваяўніча, як раней. Я неаднойчы ўжо казаў і пісаў, што веру кожнага з нас выявіць сам Гасподзь. І выявіцца яна, бадай, не толькі ў тым, ці часта мы ў царкву хадзілі, ці насілі асвячаць на Вербніцу вярбу, ці фарбавалі на Вялікдзень яйкі... Гэта ўсё ж такі сведчыцца іншым, хоць мы з жонкай на богаслужэнні стараемся хадзіць рэгулярна і абрады шанаваць не менш, чым нашы продкі. Дзяцей да гэтага прывучыць хацелі, аднак не прымушалі; старэйшых унукаў імкнуліся вадзіць у царкву з сабою, каб хоць нешта дайшло да іхніх душачак, і вельмі радаваліся, калі нешта назіралі. А пры ўсім гэтым трэба разумець, што шлях да храма і да Бога — заўжды індывідуальны, калі не казаць, інтымны...

***— Вы складалі анталогіі беларускай хрысціянскай прозы і паэзіі... Наколькі гэтая з'ява арганічная для нашай культуры, ці ёсць працяг сёння?***

— Думаю, што гэтая з'ява арганічная ў такой самай меры, як і рэлігійнасць. Скажам, агульнавядома, што ў пэўных сітуацыях атэізм развейваецца. А па вялікім рахунку, душа кожнага з нас — хрысціянка. Проста ў сваёй рэлігійнасці не ўсе прызнаюцца, некаторыя — нават самі сабе, ну а сведчыць пра яе адкрыта ў савецкі час было нават небяспечна. У апошнія ж дзесяцігоддзі — наадварот. І гэта, на жаль, прывяло да прыкрай дэвальвацыі: паказваць набожнасць стала, прашу прабачэння, модай. Але, нягледзячы на ўсё гэта, шчырае богашукальніцтва не знікала і не знікне. Калі вы звярнулі ўвагу, назва ў прыгаданых анталогій — «Насустрач Духу», і яна азначае рух насустрач Духу Святому, Богу. А рухацца ў гэтым напрамку людзі не перастаюць. І творы адпаведнай тэматыкі як з'яўляліся ў розныя часы, так і будуць з'яўляцца. Дарэчы, не зусім жа выпадкова мой унук-філфакавец піша курсавую работу пра адлюстраванне подзвігу прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага ў сучаснай беларускай літаратуры.

***— Адна з вашых манаграфій называецца «Пошук спрадвечнай існасці: Беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння». Ці можна сказаць, што тыя пошукі завершаны? Ці працягваюцца, як і кім, яны ў XXI стагоддзі? І якую ролю адыгрывае ў іх гістарычная памяць?***

— Глыбокае ўсведамленне спрадвечнай існасці павінна закладваць аснову для быційна патрэбных высноў, а таксама для вызначэння жаданых перспектыў. Без гэтага немагчыма фармуляваць як звязанае з універсальнымі катэгорыямі, так і, скажам, з актуальнай ідэалогіяй — і нацыянальнай, і дзяржаўнай. Натуральна, пры максімальным уліку гістарычнай памяці. Што ж да пошукаў правільнага ўсведамлення спрадвечнай існасці свайго народа, асабліва на тым этапе, калі ён толькі што атрымаў дзяржаўнасць, то іх неабходна працягваць, і завершанымі яны проста не могуць быць.

**Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Ігуменскі тракт
№ 28 (336)

**Калісьці Уладзімір Караткевіч з захапленнем пісаў: «Рэаліст у рэальным жыцці, беларус вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах... Менавіта таму запісаныя фалькларыстамі беларускія казкі не ўлезлі б і ў сотню тамоў».**

**Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў таксама увесь час папаўняецца. Варта пачытаць яго, каб, як і Караткевіч, уразіцца нашым багаццем — ад традыцыі шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку да клёцак з душамі, ад Мацюкоўскага «Маслянага барана» да казак Лідзіі Цыбульскай з вёскі Магільна... Многае можна цяпер пабачыць на свае вочы, не выходзячы з хаты — кожны з элементаў спіса робіцца сюжэтам для выпуску перадачы «Жывая спадчына» канала «Беларусь 3». Праект сёлета перамог у конкурсе «Тэлевяршыня» ў намінацыі «Культурна-асветніцкая праграма». Пра тое, як сёння пачуваецца наша культурная спадчына, якія змены з ёю адбываюцца, мы сабраліся пагаварыць утрох — рэжысёр і сцэнарыст перадачы «Жывая спадчына» Надзея ГАБЕЦ, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук Тацццяна ВАЛОДЗІНА і я, пісьменніца Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Трыялогія

# АБРОЧНАЯ СВЯЧА, КОНІКІ, НАМЁТКА:
## як зберагчы беларускі фальклор

### ЧАМУ СТУДЭНТКА НЕ МОЖА ПРАСПЯВАЦЬ ЖНІЎНУЮ ПЕСНЮ

**Л. Рублеўская:** На першы погляд здаецца, што матэрыяльная спадчына больш разбураецца — бо яе страты відавочныя. Вось стаяў млын — сёлета адзін падмурак... А песні, замовы, абрады — здаецца, павінны перадавацца лёгка...

**Т. Валодзіна:** Можа, нематэрыяльная спадчына, тыя ж песні, і больш трывалая, але ў нас няма ніякіх сведчанняў, якія ж яны былі пяцьсот гадоў таму. Гэта толькі наша рэканструкцыя.

**Л. Р.:** То-бок «еўравокны» «ўстаўляюць» і ў нематэрыяльную спадчыну? Мне распавядалі, як падчас збірання фальклору вясковыя бабулькі спявалі на дыктафон савецкую папсу ва ўпэўненасці, што гэта іхняе, спаконвечнае.

**Н. Габец:** Мы знялі ўжо дзевяноста праграм «Жывая спадчына», пяты год працуем... Я часцей сутыкаюся не з такімі падробкамі, а з іншым. Сыходзіць чалавек-носьбіт. Ёсць, напрыклад, такі элемент, як казкі Лідзіі Цыбульскай з Магільна. Як іх зняць, калі казачніцы ўжо няма? Тут, праўда, знайшлі выйсце, далучылі сям'ю казачніцы, яе дачку, брата, суседку...

**Т. В.:** Многія нашы сучаснікі ўспрымаюць фальклор як нешта, што ўзнікла ў даўніну і мусіць быць у нязменным выглядзе. Фальклор развіваецца разам з жыццём. Часам студэнтка пераймаецца — як праспяваць жніўную песню? Чаму яна не гучыць з нашых вуснаў? А адказ вельмі просты: яна прагучыць, калі ты, дарагая, дзень прастаіш, угнуўшыся, у гарачыні ў полі, і ведаеш, што калі прыйдзеш дадому, там яшчэ свякруха пачне цябе «прасаваць». Вось тады з'явіцца той надрыў, які мусіць быць у жніўнай песні, і мурашкі ад яе па скуры... Фальклор жыве і максімальна адпавядае таму, што было раней, калі гэта запатрабавана сёння. Трэба вылечыць рожу, якой урачы не даюць рады — значыць, замова будзе жыць. Няма столькі коней, як раней — і сродкі народнай медыцыны, звязаныя з коньмі, знікаюць.

**Н. Г.:** Часам змяняць элемент даводзіцца з-за абставін... Мы неяк запісвалі ў вёсцы Ельскага раёна элемент са спіса — мясцовы песенны стыль. Выканаўцаў засталося тры бабулькі. Глухая вёсачка, бабулькі апрануліся, падрыхтаваліся... І я разумею, што іх утрох прыгожа не здыму, яны не сяпоюць, як трэба... Адна словы забывае, у другой голас недацягвае, разнабой... Я вырашыла запісаць усіх паасобку. Пра кожную бабульку знялі асобную гісторыю, папрасілі праспяваць па куплеце песні, наколькі хопіць дыхання.

**Т. В.:** Там такія спеўныя традыцыі, што зусім не абавязкова спяваць усім разам.

**Л. Р.:** А як іх спадчына будзе перадавацца далей?

**Н. Г.:** Дырэктар мясцовага клуба забірае гэтых бабулек на сваёй машыне два разы на тыдзень, прывозіць у клуб, каб яны спявалі, тлумачылі, вучылі... Амаль увесь рэпертуар такім чынам перадалі.

### «КЛУБНІЦЫ» І НОСЬБІТЫ: ПРА ЗНІКНЕННЕ І АДРАДЖЭННЕ АБРАДАЎ

**Т. В.:** Паездзіўшы па Беларусі, разумееш вельмі выразна: паняцце «беларускі фальклор» увогуле — абстракцыя. Ёсць фальклор Пасожжа, Усходняй Лепельшчыны і гэтак далей. Ёсць адзіны падмурак, светапогляд, але фармальнае ўвасабленне вельмі рознае, як розныя ліштвы, строі...

**Л. Р.:** А ці ёсць шанц, што гэтая адрознасць захаваецца, ці ўсё натуральным чынам змешваецца? Фальклорныя гурты ездзяць па фестывалях, чуюць іншых...

**Т. В.:** Так, нешта запазычваюць. Але калі з дзяцінства вывучыліся на пэўнай сістэме, яе вельмі цяжка змяніць. Гэтак жа з дыялектамі. Я свой з Лепельшчыны, вельмі люблю, і загаварыць на іншым мне цяжка.

**Н. Г.:** Бачыла і такое: носьбіты сышлі, а ў вёску нехта прыязджае з іншай вобласці, нават краіны, займае, напрыклад, пасаду дырэктара клуба, і пачынае традыцыю рэанімаваць, адраджаць. Вядома, нешта сыдзе, нешта набудзе новыя формы... Але ўвесь час адбываецца змешванне песень — нешта прыйшло з Украіны, з Расіі, Польшчы, Прыбалтыкі...

**Т. В.:** Толькі раней гэты працэс займаў сотні гадоў.

**Л. Р.:** У сеціве можна знайсці любыя фальклорныя запісы, пераняць... І не толькі сваёй краіны. Уніфікацыя фальклору — справа непазбежная.

**Т. В.:** Гэта балючая праблема для беларускай культуры. Прыязджае здалёк клубны работнік і пачынае вучыць мясцовых бабуль сваім прыёмам. Даводзілася сустракаць такіх актыўных «клубніц», як мы іх называем.

**Н. Г.:** Бывае, што абрад знікае і з іншых прычын... Вось уж шмат гадоў не можам зняць адзін элемент у Глыбоцкім раёне — нашэнне намёткі. Святары забаранілі жанчынам тое рабіць.

**Т. В.:** Так, ведаю гэтую сітуацыю. Растлумачу сутнасць абраду: падчас паморку жанчыны ткалі ручнік-абыдзённік і, сабраўшыся разам, абносілі ім вёску. Фактычна, гэты абрад не знікаў. Толькі апошнім часам жанчыны не ткалі той абыдзённік, а скідваліся і куплялі разам белае палатно. У абрадзе вельмі прыгожыя дэталі. Намётку могуць несці толькі дзеці. Яны трымаюць палатно, усе вяскоўцы кладуць на яго грошы, зусім маленькіх дзяцей праносяць пад гэтай намёткай, каб былі здаровыя. Працэсія ідзе ў бок могілак, дзе адбываецца імша, затым усё ахвяруецца ў касцёл. Але святары вырашылі пакінуць ад гэтага абраду толькі імшу. Прытым што абрад мае статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці.

**Н. Г.:** Але мы не губляем надзеі. Кожны год тэлефануем тым бабулькам. Сёлета паабяцалі, што калі мы прыедзем, абрад правядуць, можа, у падкарочаным выглядзе.

**Т. В.:** Я ў гэтым бачу шкоду — калі стварэцца імітацыя абраду. Мы нават думалі ініцыіраваць працэс, якога яшчэ не было — выключэнне элемента са спіса культурных каштоўнасцяў, калі ён разбураны.

**Н. Г.:** Ёсць яшчэ абрад, звязаны з рэлігіяй — «Перанос Міхайлаўскай свячы» ў аграгарадку Вяляцічы Барысаўскага раёна. Толькі сабраліся ехаць здымаць — аказалася, мясцовы святар забірае неабходны для абраду абраз на рэстаўрацыю. Я ўжо і так, і гэтак прасіла... Бабулькі плачуць... Мы ж, кажуць, і да вайны, і падчас вайны тую ікону насілі... І ўся вёска падрыхтавалася. А тую ж ікону арханёла Міхаіла перадаюць для захавання на год з хаты ў хату, ужо вызначылі, да каго яе несці... І неяк я ўсё ж угаварыла таго святара.

**Т. В.:** Яшчэ, каб абрад захаваўся, у вёсцы мусяць жыць людзі, не дачнікі. Узяць Давыд-Гарадок з абрадам шчадравання «Конікі». Шмат моладзі, усё буяе. А прыедзеш у вёску, дзе тры хаты засталося — якое там калядаванне?

**Н. Г.:** Мне вельмі спадабаўся горад Іванава. Моцная перадача і захаванне элемента — школы бондарства. Сотня навучэнцаў — падлеткаў, дзяцей, нават дзяўчаты ёсць — спасцігаюць тое майстэрства. Нам паказалі гатовую прадукцыю — цэлыя стэлажы драўлянага дабра...

**Л. Р.:** Калі на нечым можна зарабіць, яно і перадаецца.

**Т. В.:** Калі ў спіс нематэрыяльнай культуры ўносяцца такія элементы, як бондарства, валенне, ткацтва, маюцца на ўвазе не вырабы, а тэхналогіі, веды. На Беларусі сёння ўсё, што звязана з рамёствамі, не пад пагрозай. Не пад такой, як песня, якую перадаваць нашмат цяжэй, чым навучыць ткаць. Ёсць эканамічны складнік, выраб можна прадаць. А дзе і хто прадасць казкі Лідзіі Цыбульскай? Для захавання трэба, каб абрад служыў для чагосьці канкрэтнага. Вось веткаўскае «Ваджэнне стралы»... Стралу вядуць і хаваюць для таго, каб не было навальніцы, каб не балела спіна. А каб спіна не балела — кожны асабіста зацікаўлены. Ці калі Русалку водзяць, разрываюць вянок. Я калі першы раз пагледзела, здзівілася. Вядуць Русалку, яна ўся ўбраная ў зяленіну. Даходзіць да пэўнай кропкі... І на яе накідваецца ўся вёска, каб ухапіць з яе ўбору галінку. Чаму? Бо гэтая галінка надзяляецца ўласцівасцю выганяць з гарода мядзведку. Калі ў мяне мядзведка з'ела ў гародзе ўсё, дык і я русалку б растрыбушыла!

### ЦІ МАЮЦЬ КАШТОЎНАСЦЬ «ЖОРСТКІЯ РАМАНСЫ» І ДЗЯВОЧЫЯ ШКОЛЬНЫЯ «АНКЕТЫ»?

**Т. В.:** Лічыць, што нашы продкі прымхлівыя, а мы такія гарадскія, прагрэсіўныя — неправамерна. Яшчэ ў студэнцтве здзівілася, колькі ў горадзе правілаў: як вернешся, пагледзі ў люстэрка, грошы ў рукі не давай, а толькі кладзі на стол...

**Л. Р.:** Вы закранулі тэму, якая мяне даўно хвалюе — сучасны гарадскі фальклор. У Беларусі я амаль не знайшла работ пра гэта. У той жа Расіі даўно выходзяць цікавыя даследаванні — пра фальклор і абрады турыстаў, парашутыстаў, студэнтаў, праграмістаў, бальніц, турмаў, каляхрамавага асяродка — усё падлягае фіксацыі і вывучэнню. Памятаю, як мяне ўразіў артыкул расійскай даследчыцы Белаусавай пра фальклор у сучасным радзільным абрадзе. На падставе сведчанняў з радзільных дамоў постсавецкай прасторы вымалёўваецца карціна, у якой можна пазнаць архаічны абрад ініцыяцыі. Для мяне заўсёды было відавочна, што фальклор ствараецца тут і цяпер.

**Т. В.:** Па вялікім рахунку, і ў нашым аддзеле мусілі б даследаваць гарадскі фальклор. Але няма каму. Мы яшчэ не ўсё запісалі ад бабуль. А яны паміраюць, ковід зноў жа падкасіў іх. Хоць і працаваць з гарадскім фальклорам вельмі трэба!

**Л. Р.:** Вельмі трэба... Ён жа вось, побач... Набыла аб'ёмістае навуковае выданне «Рукописный девичий рассказ», пазнала шмат што са свайго дзяцінства.

**Т. В.:** Я нават хацела стварыць суполку ў «Фэйсбуку», каб сабраць матэрыял — бо ў многіх, напэўна, захоўваюцца сшыткі-«анкеты», якія раней запаўнялі дзяўчынкі ў кожным класе.

**Л. Р.:** Там жа дзяўчаты паказвалі ўсё, што ўмелі. Трэба было размаляваць, нешта ўклеіць, напісаць тэкст прыгожай песні, верш... І не толькі Алы Пугачовай ці Сафіі Ратару, але і жорсткі гарадскі раманс. Гэта ж таксама частка фальклору.

**Т. В.:** Якую мы, беларусы, таксама «прашляпілі».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Л. Р.:** Памятаю, як некаторыя абураліся, калі ў папулярны музычны альбом уключылі песню пра Надзейку — жорсткі гарадскі раманс на трасянцы. Прафанацыя, маўляў, ніякі не фальклор...

**Т. В.:** Я сама толькі апошняе дзесяцігоддзе стала актыўна збіраць тыя жорсткія рамансы. Раней калі мне ў экспедыцыі пачыналі такое спяваць, я рабіла выгляд, што слухаю, але не запісвала. Лічыла — ганьба... А цяпер глядзіш — якое гэта багацце! Сабралі мы іх няблага. Цэлая кніжачка выдадзена, уклала Алена Кукрэш.

**Л. Р.:** Па савецкай міфалогіі таксама не знайшла нічога ў беларускай навуцы...

**Т. В.:** Так, гэтую дзялянку мы таксама ўпусцілі. І мне не падабаецца, калі фальклор зводзяць толькі да танцаў, песень і казак. Фальклор — гэта ўсё. Уяўленні, звязаныя з ежай, адзеннем, распарадкам дня, гігіенай, сяброўствам, каханнем... Паглядзіце, як на нашых вачах разбураецца такі моцны кансерватыўны пласт, як культура пахавання. Яшчэ дзесяць гадоў таму было звычайна — нябожчык у хаце, усе збіраюцца, развітваюцца. Безліч прыкмет — гэта можна, тое нельга, пастаў, запалі, падкладзі... Па паверхах ходзім, збіраем грошы. Людзі стаяць унізе каля пад'езда, чакаюць, калі вынесуць нябожчыка. Сёння нябожчыка забіраюць, і з ім развітваюцца ў рытуальнай зале. А які быў магутны сродак кансалідацыі! Збіралася ўся сям'я, суседзі. Няма перасцярог — вось тое зрабілі няправільна, гэтага не зрабілі, бяда будзе.

**Л. Р.:** Можа, і лепей, што няма? Разам з усімі страхамі, што няправільна зрабіўшы, нехта яшчэ памрэ. Час ідзе, з'явілася зручная рытуальная служба. Як у свой час бальніцы і радзільныя дамы. Хіба ў кожнага памерлага сёння столькі сваякоў, сяброў, добрых суседзяў, каб сваімі сіламі зрабілі ўсё «па традыцыі»?

**Т. В.:** Сэнс быў у тым, каб чалавек не заставаўся сам-насам са сваім горам. Ёсць шмат даследаванняў, як чалавек традыцыі перажывае гора. Каб гэта адбывалася без разбурэння асобы, усё было вельмі рэгламентавана. Калі можна плакаць, калі не, з кім гаварыць. А сёння — колькі дэпрэсій! Чалавек ведаў, што калі ён трымаецца правілаў, усё рухаецца, як належыць, а беды — ад парушэння гэтых правілаў.

**Л. Р.:** Цяпер традыцыі змешваюцца. Калі гэта на Беларусі ў якасці вясельнага атрыбута былі падвязкі для панчох? А сёння — амаль абавязкова, іх шырокі выбар. І букеты кідаюць... Падгледзелі ў амерыканскіх рамантычных камедыях.

**Н. Г.:** Хэлаўін святкуецца шырэй, чым Каляды. Інвазійная культура, якая прыжылася, як баршчавік.

**Т. В.:** А я няблага стаўлюся да Хэлаўіна.

**Н. Г.:** Дык у нас сваё цудоўнае свята ёсць — Дзяды. Толькі што без гарбуза.

**Т. В.:** Моладзі яно незразумелае, таму што бацькі не выхавалі цікавасці. А Хэлаўін відовішчным кампанентам маладых захапляе.

**Н. Г.:** З любога абраду хочуць зрабіць шоу...

**Л. Р.:** Зрэшты, любы абрад можна зрабіць актуальным. На суполцы «Літаратурнае прадмесце» мы кожны год адзначалі Літаратурныя Дзяды — збіраліся, запальвалі свечкі, прыносілі фотаздымкі памерлых літаратараў і ўспаміналі пра сваіх папярэднікаў, чыталі іх творы.

**Т. В.:** Элементы набываюць іншыя формы. Замест анекдотаў — мемы, бо слова ўжо мала, трэба карцінка. Аўтэнтычны фальклор, як і опера, стаў элітарным мастацтвам. Мы ж не ўсе ходзім у оперны тэатр. Любоў да класічнай музыкі выхоўваецца. Трэба вучыць успрымаць і фальклор.

**Н. Г.:** Спадзяюся, нашы перадачы гэтаму якраз вучаць. Цяпер хочам закончыць тэму саломапляцення, збіраемся ў Магілёўскую вобласць. Пасля паедзем на Прыпяць, зняць перадачу пра новы элемент, які нядаўна ўвайшоў у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, — «Палескі човен». А далей — абрад «Конікі» ў Давыд-Гарадку, а яшчэ «дранік-тур», як мы жартуем... Перадача пра дранікі. Вясной, калі здымем сотую праграму, вядома, прыдумаем што-небудзь адметнае на «Беларусь-3». Думаю, работы хопіць гады на два — бо спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі працягвае папаўняцца.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Выстава

# ЗНАКАМІТЫЯ І НЕЗАБЫТЫЯ:
## творцы глядзяць з партрэтаў

**Ідзеш на выстаўку, а прыходзіш на сустрэчу. З карцін глядзяць людзі, якія яшчэ нядаўна былі з намі і працавалі на тое, што аб'ядноўвае грамадства, — кожны ў сваёй галіне. Так і сталі знакамітымі, любімымі, выклікалі захапленне. Але пасля сыходу нічога не канчаецца, бо зробленую справу працягваюць паслядоўнікі і вучні, людзі нераўнадушныя, прыхільнікі, якія захоўваюць памяць пра сваіх папярэднікаў — народных і заслужаных, ці проста харошых творцаў. «Гісторыя ў асобах» — гэта выстаўка мастака Юрыя Крупянкова, які прадставіў серыю партрэтаў выдатных асоб беларускай культуры.**

Цяпер у выставачнай зале Музея гісторыі горада Мінска нібыта ўрачыстая імпрэза з удзелам знаных асоб, і кожны можа весці маўклівую гутарку з тымі, каго часам лічылі недасягальнымі, але пры гэтым маглі сустрэць незнарок на вуліцах сталіцы ці ўбачыць у гарадах Беларусі, куды яны прыязджалі з выстаўкамі, канцэртамі ці для ўдзелу ў культурных падзеях. Аўтар работ Юрый Крупянкоў з'яўляецца выкладчыкам Беларускай акадэміі мастацтваў і такім чынам дае ўрок павагі да асоб, якія праз сваю справу стварылі славу Беларусі.



Юрый КРУПЯНКОЎ на выстаўцы.

— Над партрэтамі выдатных дзеячаў культуры Беларусі я пачаў працаваць у 2004 годзе, калі стаў асістэнтам-стажорам у Акадэміі мастацтваў — тады абраў гэтую тэму і напісаў першыя работы, — тлумачыць Юрый Крупянкоў. — З тых часоў я перыядычна вяртаюся да тэмы партрэтаў выдатных асоб. Цяпер гатовыя 12, дзевяць з іх прадстаўлены на выстаўцы, ідэю якой падтрымала дырэктар Музея горада Мінска Галіна Ладзісава. Прадставіць усе партрэты аказалася немагчыма ў тым ліку з-за абмежаванай выставачнай прасторы. Але асобныя работы раней прадстаўляліся на іншых рэспубліканскіх выстаўках, адзін твор знаходзіцца ва ўласнасці Музея горада Мінска, яго можна ўбачыць у галерэі Міхаіла Савіцкага — гэта партрэт самога Савіцкага, народнага мастака СССР і Беларусі. З ім і некаторымі героямі партрэтаў я быў знаёмы асабіста. Сярод іх ёсць мае настаўнікі, і я лічыў сваім абавязкам напісаць іх. Гэта мемарыяльныя партрэты: людзі сыходзяць, але пакідаюць значны след у гісторыі. Я б хацеў, каб іх памяталі.

Бачыш герояў на партрэтах — і нават хочацца павітацца, калі іх бачыў ці ведаў асабіста. А калі не ведаў — то пазнаёміцца і задумацца, чым кожны з іх узбагаціў жыццё. З партрэтаў глядзяць заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь Леанід Левін, заслужаны артыст краіны Ілья Курган, нашы народныя мастакі Май Данцыг, Арлен Кашкурэвіч, Заір Азгур, любімыя народныя артысты Беларусі Міхаіл Пташук, Яўген Глебаў, Уладзімір Мулявін, Міхаіл Фінберг... Аўтар Юрый Крупянкоў вызначае жанр сваіх работ як партрэт-прафесія. Таму што ён імкнуўся паказаць, кім быў чалавек і праз што яго імя стала вядомае на ўсю краіну.

— Калі працую, стараюся больш даведацца пра чалавека. Я лічу сябе мастаком рэалістычнага кірунку, імкнуся адлюстроўваць аб'ектыўную рэальнасць. На мой погляд, партрэт павінен быць традыцыйным, таму што трэба, каб чалавека пазнавалі, — адзначае аўтар. — Але ўсё роўна дадаецца суб'ектыўнасць. Па-першае, каго пісаць — мой асабісты выбар. А па-другое, я кіруюся ўласнымі адчуваннямі гэтых асоб, і ў працэсе работы так ці інакш удзельнічаюць мае эмоцыі. Справа не столькі ў дакладнасці (для гэтага ёсць фатаграфія), таму што трэба стварыць вобраз, які б чапляў і даваў адчуванне асаблівага віду творчасці, якому герой прысвяціў жыццё, каб было бачна, мастак ці дырыжор на партрэце. Прычым каб тое разумелі нават прадстаўнікі наступных пакаленняў. Напрыклад, моладзь можа задумацца: а хто такі Ілья Курган? Людзі сталага веку ведаюць, памятаюць яго голас, які гучаў па радыё. Праўда, не ўсе пры гэтым ведаюць, як ён выглядаў. Мне пашчасціла: мы з ім адначасова працавалі ў Акадэміі мастацтваў, толькі ён на тэатральным факультэце. Спрабую перадаць адчуванне яго асобы іншым. Архітэктар Леанід Левін зрабіў вялікі ўнёсак у будаўніцтва горада Мінска і стварэнне значных мемарыялаў — я імкнуўся гэта абазначыць. З Уладзімірам Мулявіным мы не былі знаёмыя, але я вялікі прыхільнік творчасці «Песняроў». Заўсёды здзіўляўся, як чалавек, які нарадзіўся ў Расіі, змог захапіць слухачоў беларускім фальклорам і мовай. Ці Максім Багдановіч, які таксама не жыў тут, але стаў пісаць па-беларуску — у мяне некалькі ягоных партрэтаў, якія дэманстраваліся раней. Мне вельмі падабаецца музыка Яўгена Глебава. А як паказаць кампазітара? Зусім няпростая задача, бо чалавек складае музыку ў галаве. Я вырашыў, што ён павінен быць каля раяля, але нібыта адхіліўшыся ад яго. Здаецца, самы просты ход — паказаць сродкі работы, якія б сталі сімваламі прафесіі. Як у партрэце Мая Данцыга. Але пранікліві гледач убачыць, што ў яго пэндзаль і палітра — нібыта шчыт і меч, а ён сам — як рыцар мастацтва. У той час як Арлен Кашкурэвіч падчас творчага працэсу — каля чыстага аркуша, дзе можна рабіць накіды...

**Цяпер у выставачнай зале Музея гісторыі горада Мінска нібыта ўрачыстая імпрэза з удзелам знаных асоб, і кожны можа весці маўклівую гутарку з тымі, каго часам лічылі недасягальнымі, але пры гэтым маглі сустрэць незнарок на вуліцах сталіцы ці ўбачыць у гарадах Беларусі, куды яны прыязджалі з выстаўкамі, канцэртамі ці для ўдзелу ў культурных падзеях.**

Юрый Крупянкоў гаворыць, што калі вядомы чалавек сыходзіць, заўсёды ёсць адчуванне вялікай страты. Тады і з'яўляецца разуменне: трэба пісаць партрэт. Для яго істотны ўнёсак героя, а не яго асабістыя якасці, бо ведае, наколькі няпросты характар могуць мець творчыя людзі ў жыцці. Напрыклад, ён тры гады праходзіў стажыроўку ў творчых майстэрнях Міхаіла Савіцкага. Але адносіны з майстрам доўга не складваліся, даходзіла нават да адлічэння. Але калі лёс дае шанц, трэба ставіцца да яго з удзячнасцю. І пасля заканчэння Юрый Георгіевіч на працягу многіх гадоў хадзіў віншаваць Савіцкага з Днём нараджэння. Сёння ён удзячны сваім настаўнікам — Маю Вольфавічу і Міхаілу Андрэевічу. Гэта цяпер яны сталі безумоўнымі класікамі, а ў свой час абодва былі эксперыментатарамі разам з тым вучылі ставіцца да мастацтва адказна. Работы Данцыга ўвогуле доўгі час не прымалі. Напрыклад, ён расказваў, якія праблемы былі за савецкім часам з вядомай карцінай «Навасёлы», калі даводзілася адказваць на пытанне: «Як гэта ў людзей зусім нічога няма? Непарадак...» Прыйшлося дамаляваць туфлікі, тады работу прынялі. А потым ён гэтыя туфлікі ўсё ж ціхенька прыбраў. Яго мастацтва было сумленным...

— Я ўдзячны сваім настаўнікам і часта думаю, як бы яны паставіліся да таго, што я раблю. Усе парады, якія яны давалі, былі скіраваныя на творчы рост. Імкнуся адпавядаць, — гаворыць Юрый Крупянкоў. — Яны тлумачылі, што кожная карціна — асобнае выказванне. На жаль, час такіх карцін, як «З'яўленне Хрыста народу», мінуў. Міхаіл Савіцкі казаў, што пісаць карціны трэба для музеяў. Думаю, ён меў рацыю: табе не павінна быць сорамна за створанае. Але сёння не самы лепшы час для карціны (дапускаю, што ён можа вярнуцца). Напісаць твор — гэта выдаткаваць год жыцця, у найлепшым выпадку, а потым не ведаць, дзе яе паказаць. А ў мяне многія карціны складваюцца ў пэўныя серыі. Я ніколі не ставіў перад сабой задач ствараць серыі, але калі творы аб'ядноўваюцца тэматычна, то з іх натуральна скласці асобную выстаўку. Такім чынам выстаўку партрэтаў я прапанаваў Музею горада Мінска, дзе яна глядзіцца суцэльна — менавіта як серыя: разам партрэты ўвасабляюць агульнанародную памяць.

Выстаўка «Гісторыя ў асобах» ладзіцца ў межах праекта «Маё імя — Мінск», які прысвечаны 955-годдзю беларускай сталіцы. Падчас яе адкрыцця аўтар прадстаўляў Беларусь на выстаўцы ў Казахстане і быў пазбаўлены эмоцый ад урачыстасці. Але вельмі разлічвае на зваротную сувязь і водгукі. Для яго важны вынік: каб за працяглы час дэманстрацыі партрэтаў новую выставачную залу Музея горада Мінска (па адрасе: Ракаўская, 17) наведала як мага больш гледачоў, якія шануюць беларускую культуру і асоб, што ўвайшлі ў гісторыю як стваральнікі і выразнікі яе духу.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Мотобур ВТ 360 | 1 512,00 | 151,20 | 75,60 |
| 2 | Нивелир лазерный БОШ линейный | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 3 | Станок 8Г | 1 728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 4 | Станок СМЖ | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 5 | Пресс-ножницы | 2 520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 6 | Вагон-бытовка строительная | 705,60 | 70,56 | 35,28 |
| 7 | Вагон-бытовка строительная | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 8 | Вышка строительная сборно-разборная передвижная ВСРП-2500-20 | 648,00 | 64,80 | 32,40 |
| 9 | Компьютеры, согласно списку 1: https://docs.google.com/document/d/1JzbpKeJTzQE4Z9CrgAdLod5NMS7Vcahx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1 232,32 | 123,23 | 61,62 |
| 10 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007, общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации; мебель, согласно списку 2: https://docs.google.com/document/d/1JfGDgIl07rVeKKkVpMHVTxKuAb91IAXi/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 137 557,34 | 13 755,73 | 6 877,87 |
| 11 | Оборудование, согласно списку 3: https://docs.google.com/document/d/1EuWvjcW5KZJsl4iM5STLhFMh1QlXcAww/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 6 735,86 | 673,59 | 336,79 |
| 12 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998, общей площадью 870,5 кв. м; мебель, согласно списку 4: https://docs.google.com/document/d/1OuPLBa0AxoC8WSqv1QTePYtLqxJ8zovu/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 194 311,31 | 19 431,13 | 9 715,57 |
| 13 | Леса, согласно списку 5: https://docs.google.com/document/d/1iSG4vAz0k2sOJeXe0-m-dfrqv0ut7Zzn/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2 133,14 | 213,31 | 106,66 |
| 14 | Столы каменщика, согласно списку 6: https://docs.google.com/document/d/1uHq2x5x-ZPq_zi6MhDw0uroMSM5E8Pzb/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1 907,99 | 190,80 | 95,40 |

В отношении лотов №№ 1–15 проводятся четвертые повторные торги.
**Стоимость снижена на 40 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 110 (29732) от 08.06.2022, № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 7, № 159 (29781) от 16.08.2022, № 175 (29797) от 07.09.2022, стр. 6

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **18 октября 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 04.10.2022 до 16.00 14.10.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Местонахождение имущества** | **Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых 18.10.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лотам 1–9, 11, 13–14 составляет 7 % от конечной цены предмета торгов; по лотам 10, 12 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Татьяне Степановне (+375291877401).**
По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру, +375293396845.
**Дополнительная информация по лотам №№ 1-9, 11, 13, 14 по тел. +375293042560, Андрей, по лотам №№ 10, 12 – по тел. +375293082762, Екатерина.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 19 октября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5, 7, 19, 22, 25, 26, 28, 29, 35, 46, 48, 49, 50)**
**размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).**
**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–5; 8–16; 19, 21, 24–28; 30–35; 41–50, 53)**
**размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637).**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029)303-53-09 – Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

